РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 СТУДЗЕНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 18 (30406)

«МЫ ІМКНУЛІСЯ ЗРАБІЦЬ УСЁ ТАК ДЭМАКРАТЫЧНА, КАБ НАВАТ САМЫ АПОШНІ ВОРАГ НЕ ПРЫЧАПІЎСЯ»

У першы дзень пасля выбараў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з назіральнікамі і прымаў віншаванні

(Працяг на 2 стар.)

З ПАЧУЦЦЁМ АДКАЗНАСЦІ І ВЫСОКАЙ ЯЎКАЙ

Цэнтрвыбаркам аб'явіў папярэднія вынікі галасавання

Цэнтральная выбарчая камісія падвяла папярэднія вынікі выбараў Прэзідэнта Беларусі. Перамогу атрымаў Аляксандр Лукашэнка, за якога выбаршчыкі аддалі 5 136 293 галасы. Вынікі ў панядзелак агучыў старшыня ЦВК Ігар КАРПЕНКА. СТАР. 4–5

Падлік галасоў на ўчастку для галасавання № 3 у Шклове.

Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

ЯК РАСПРАЦОЎВАЮЦЦА НОВЫЯ САРТЫ СЕЛЬГАСКУЛЬТУР 10

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ДОБРАЯ НАВІНА

ЖЫЛЛЁ Ў ЗОНЕ ДОСТУПУ

Падпісаны ўказ аб асаблівасцях выдзялення і выкарыстання арэнднага жылля

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб асаблівасцях прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля», якім комплексна рэгулюецца прадастаўленне такога жылля работнікам найбольш запатрабаваных у краіне прафесій. Дакумент прыняты ў мэтах развіцця перадвыбарнай праграмы кіраўніка дзяржавы аб шырокім будаўніцтве арэнднага жылля. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У адпаведнасці з указам раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты надзелены правам вызначаць на месцах пералік спецыялістаў, у якіх мае патрэбу рэальны сектар і сацыяльная сфера рэгіёна, і прымаць рашэнні аб выдзяленні ім арэнднага жылля на падставе хадайніцтваў работадаўцаў з ліку дзяржаўных органаў і арганізацый.

Аплата за карыстанне арэндным жыллём асобам найбольш запатрабаваных прафесій, якія маюць першачарговае права на такое жыллё, будзе разлічвацца з улікам паніжальнага каэфіцыента. Указ накіраваны на павышэнне сацыяльнай абароненасці спецыялістаў розных галін эканомікі, у тым ліку якія прыбылі для работы па размеркаванні, і будзе садзейнічаць іх замацаванню на рабочых месцах.

Такім чынам у Беларусі прадаўжаецца планамерная работа па павышэнні даступнасці жылля для грамадзян. СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

«МЫ ІМКНУЛІСЯ ЗРАБІЦЬ УСЁ ТАК ДЭМАКРАТЫЧНА, КАБ НАВАТ САМЫ АПОШНІ ВОРАГ НЕ ПРЫЧАПІЎСЯ»

Першае мерапрыемства ў графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ пасля выбараў — сустрэча з кіраўнікамі місій назіральнікаў ад міжнародных арганізацый

Вітаючы кіраўніка місіі назіральнікаў ад СНД Сяргея Лебедзева, кіраўнік дзяржавы падзякаваў за работу на выбарах. «На гэтых выбарах мы імкнуліся зрабіць усё так дэмакратычна, каб нават самы апошні вораг не прычапіўся, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы стараліся вельмі. Я стараўся не ўмешвацца ў выбары і не праводзіць залішнюю агітацыю».

Фота БелТА.

Прэзідэнт падкрэсліў, што цэнтральнымі фігурамі ў гэтай кампаніі былі старшыня ЦВК і яго калегі, якія ўвесь час інфармавалі грамадства пра сітуацыю, што складвалася на датэрміновым галасаванні і падчас выбараў. «Карыстаючыся выпадкам у сувязі з тым, што я першы раз з'яўляюся на экранах пасля выбараў, хацеў бы падзякаваць нашай Цэнтральнай выбарчай камісіі і асабліва бескарыслівым людзям, якія працавалі на ўчастках. Гэта яны ўзялі на сябе асноўны груз. Я спадзяюся, што ў цэлым яны выканалі годна сваю місію. Гэта характарызуе не толькі ўладу, але і беларускі народ», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы папрасіў кіраўніка місіі назіральнікаў ад СНД падзяліцца сваімі прапановамі і заўвагамі наконт выбарчага працэсу. «Магчыма, вы так па-сяброўску бакавым зрокам нешта заўважылі, вы скажыце. Мы людзі разумныя, гатовыя выправіць, — сказаў ён. — Яшчэ раз удзячны вам за тое, што вы ў гэты няпросты для Беларусі час прыехалі да нас і смела і адкрыта назіралі за тым працэсам, які адбываецца».

«ПРЫЕХАЛІ ТЫЯ, ХТО ХАЦЕЎ ПРЫЕХАЦЬ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка таксама сустрэўся з генеральным сакратаром Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Нурланам Ермекбаевым, які ўзначальвае місію ШАС па назіранні за выбарамі.

Падзякаваўшы яму за работу місіі, Прэзідэнт адзначыў, што пазіцыя Беларусі ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва вядомая. «Мы будзем усяляк працаваць для таго, каб арганізацыя не толькі развівалася, але і ўмацоўвалася, для нас гэта вельмі важна, — запэўніў ён. — Мы бачым ШАС як арганізацыю, якая ў далейшым будзе сур'ёзным цэнтрам прыцягнення, цэнтрам сілы. І мы ганарымся тым, што з'яўляемся паўнапраўным членам гэтай арганізацыі. Дзякуй вам вялікі. Сваім калегам перадайце падзяку за тую работу, якую вы правялі падчас прэзідэнцкіх выбараў».

Нурлан Ермекбаеў ад імя місіі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах. «Са свайго боку, мы расцэньваем запрашэнне для назірання за выбарамі як знак адкрытасці беларускага кіраўніцтва да знешняга назірання, даверу і павагі да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва», — сказаў ён. Генсек ШАС расказаў, што за час існавання арганізацыі яе прадстаўнікі ажыццявілі каля 70 місій назіранняў за выбарамі і выпрацавалі свой падыход. «Наша місія — заўсёды прытрымлівацца прынцыпаў аб'ектыўнасці, нейтральнасці. Але ў той жа час мы разумеем, што выбары ў кожнай краіне праводзяцца народам і для народа і ўсюды неабходна ўлічваць асаблівасці той ці іншай дзяржавы. Мы з гэтага выходзім і ацэньваем сам працэс падрыхтоўкі, правядзення выбараў, але не вынікі», — адзначыў Нурлан Ермекбаеў. Ён падкрэсліў, што калі ад назіральнікаў і былі нейкія тэхнічныя заўвагі, то яны ў двухбаковым парадку выказваліся кіраўніцтву выбарчых камісій. У цэлым генсек ШАС адзначыў высокі ўзровень арганізацыі выбараў і высокі ўзровень падрыхтоўкі членаў выбарчых камісій. «І мы бачылі, што выбаршчыкі са шчырым энтузіязмам прыходзілі на ўчасткі. Яны хочуць удзельнічаць у прыняцці рашэнняў аб будучыні сваёй краіны», — сказаў ён.

«МЫ БЫЛІ АДКРЫТЫЯ»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў гэтую кампанію беларусы ні ад каго не закрываліся і нікому не адмаўлялі ў жаданні прыехаць папрацаваць на выбарах. Многія скарысталіся гэтым, акрамя прадстаўнікоў БДІПЧ АБСЕ. «Мы іх запрасілі, у іх было дзесяць ці колькі там дзён, каб прыехаць і паназіраць за гэтымі выбарамі. Не прыехалі. Ну, не прыехалі. Прыехалі тыя, хто хацеў. Таму чаго нас у гэтым папракаць», — сказаў беларускі лідар. Ён нагадаў, што яшчэ да правядзення асноўнага дня галасавання Еўрапарламентам быў падрыхтаваны дакумент аб тым, што выбары яны не прызнаюць. «Ну як можна ацэньваць працэс, калі яго няма яшчэ? Яны тут праваліліся і вельмі сур'ёзна, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы спакойна гэта ўспрымаем. Мы ведаем, што вы аб'ектыўныя людзі, разумееце не горш за іх і можаце ацаніць і заканадаўства аб выбарах, і сам працэс. Таму нам дастаткова заключэнняў — і вашых, і СНД, і дэпутатаў іншых краін». Прэзідэнт падкрэсліў, што для назірання за выбарамі прыехалі дзясяткі прадстаўнікоў партый розных краін і журналістаў, у тым ліку з вядучых сусветных сродкаў масавай інфармацыі.

«Мы былі адкрытыя. Скажу вам шчыра, нам не трэба было ні зачыняцца, ні нейкія рэсурсы адміністрацыйныя выкарыстоўваць. Гэта было б на шкоду, гэта негатыўна ахарактарызавала б выбары. Таму рабілі ўсё адкрыта», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што ўсе пажаданні і просьбы замежных гасцей выконваліся. Ён падкрэсліў, што ўпершыню журналістам нават былі паказаны стосы бюлетэняў падчас падліку галасоў. «Паказалі ўжо ўсё, што хацелі. Таму я не ведаю, якія могуць быць прэтэнзіі на выбарах. Тэхнічныя, можа быць, дык вы нам скажыце. Мы паправім», — адзначыў беларускі лідар.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

Выбары прайшлі спакойна, годна, арганізавана

Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ падзякаваў Аляксандру Лукашэнку, кіраўніцтву МЗС, ЦВК за запрашэнне для назірання за выбарамі. «Мы расцэньваем гэта як высокі давер. І мы, назіральнікі СНД, пастараліся апраўдаць гэты давер народа Беларусі. Глядзелі за выбарамі аб'ектыўна, непрадузята і — самае галоўнае — добразычліва, як сябры Беларусі. Мы прыехалі сюды не для таго, каб шукаць нейкія недахопы, а потым на аснове гэтага крычаць аб тым, што выбары недэмакратычныя, неадкрытыя і гэтак далей. Мы прыехалі як сябры. І такім добразычлівым позіркам сяброў глядзелі за выбарамі. Дзе трэба дапамагалі, звярталі ўвагу на нейкія недагляды, недахопы. Але з вялікім задавальненнем хачу сказаць, што такіх недаглядаў і недахопаў былі адзінкі. Яны мелі тэхнічны характар і не маглі паўплываць на агульны характар выбараў. Выбары прайшлі спакойна, годна, арганізавана», — сказаў ён. Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што падзяляе ацэнку работы Цэнтральнай выбарчай камісіі: людзі працавалі самааддана. «І, што я магу канстатаваць з веданнем справы, — людзі былі кампетэнтныя. Мы спецыяльна задавалі кантрольныя пытанні на выбарчых участках, на сустрэчах з выбарчымі камісіямі аб тым, ці ведаюць гэтыя людзі свае абавязкі, правілы работы з выбаршчыкамі. Усё выдатна, людзі былі добра падрыхтаваныя», — адзначыў ён.

Размаўляючы з журналістамі, Сяргей Лебедзеў яшчэ раз падкрэсліў, што місія наглядальнікаў СНД — прыехаць у Беларусь як сябры. «Таму я і на сустрэчах з заходнімі назіральнікамі казаў: «Сябры, вось вы шукаеце недахопы, недагляды. Мы бачым гэтыя асобныя недахопы. Але мы не выкарыстоўваем іх для таго, каб потым абвінавачваць арганізатараў выбараў у тым, што гэтыя выбары недэмакратычныя ці неадкрытыя». Мы прыехалі да сваіх сяброў, і мы стараемся дапамагаць арганізатарам правесці іх годна ў адпаведнасці з заканадаўствам», — сказаў ён. Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што заходнія краіны не маюць ніякага маральнага права даваць ацэнку беларускім выбарам, прызнаваць іх недэмакратычнымі. «Я шмат гадоў прапрацаваў на Захадзе, я на свае вочы бачыў іх дэмакратыю. Пра што гаворка, няма ў іх ніякай дэмакратыі, няма ў іх ніякага маральнага права нас вучыць», — заявіў ён.

У тэму

Місія назіральнікаў ШАС лічыць, што выбары прайшлі законна

Нурлан ЕРМЕКБАЕЎ у размове з журналістамі расказаў, што 17 членаў місіі за чатыры дні наведалі 109 выбарчых участкаў у розных рэгіёнах краіны. Гэта дазволіла ім сфарміраваць комплекснае меркаванне аб электаральнай кампаніі. «Праект заявы місіі назіральнікаў ШАС падрыхтаваны, і ў ім мы заяўляем, што выбары прайшлі ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі, — сказаў Нурлан Ермекбаеў. — Галоўная мэта і задача нашай місіі — ацаніць ход падрыхтоўкі і правядзення выбараў на прадмет адпаведнасці нацыянальнаму заканадаўству перш за ўсё і міжнародным абавязацельствам. У гэтым плане місія назіральнікаў ШАС лічыць, што выбары прайшлі законна і ў адпаведнасці з усімі гэтымі нормамі і абавязацельствамі».

Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў ліпені 2024 года. Генеральны сакратар ШАС падкрэсліў, што з набыццём гэтага статусу Беларусь выступіла ўжо з шэрагам цікавых прапаноў і ініцыятыў, правяла шэраг мерапрыемстваў на сваёй тэрыторыі і настроена на актыўную работу ў розных сферах дзейнасці арганізацыі.

«ГЭТА ПЕРАКАНАЎЧАЯ І ЗНАЧНАЯ ПЕРАМОГА»

Аляксандра Лукашэнку павіншавалі замежныя калегі

Расійскі лідар Уладзімір Пуцін цёпла павіншаваў беларускага калегу з перакананаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах падчас тэлефоннай размовы.

Кіраўнікі дзяржаў таксама зверылі гадзіннікі па актуальных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва, абмеркавалі міжнародную тэматыку і графік маючых адбыцца кантактаў.

* * *

Ад імя ўрада Кітая і кітайскага народа шчырыя віншаванні з перамогай на выбарах выказаў **Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін.** «Рады чуць аб Вашым перавыбранні на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У апошнія гады мы з Вамі падтрымлівалі цесныя кантакты, сумесна распрацоўвалі і давалі арыенціры развіццю кітайска-беларускіх адносін, у выніку чаго нашы двухбаковыя адносіны выйшлі на найвышэйшы ў гісторыі ўзровень адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства», — гаворыцца ў віншаванні.

Сі Цзіньпін адзначыў, што паміж краінамі пастаянна ўмацоўваецца палітычны ўзаемадавер, сумеснае будаўніцтва ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» дасягнула плённых вынікаў, эфектыўна развіваецца шматбаковае супрацоўніцтва.

«Я надаю вялікае значэнне развіццю кітайска-беларускіх адносін, гатовы з Вамі прыкладаць сумесныя намаганні для прадаўжэння традыцыйнай дружбы паміж Кітаем і Беларуссю, паглыблення двухбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, садзейнічання паступальнаму развіццю кітайска-беларускіх адносін на карысць народаў дзвюх краін».

Сі Цзіньпін пажадаў Аляксандру Лукашэнку моцнага здароўя і поспехаў у рабоце, дружалюбнай Беларусі — працвітання і магутнасці, а яе народу — шчасця і дабрабыту.

* * *

Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура таксама павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах Прэзідэнта. «Я віншую нашых братоў і сясцёр, мужны беларускі народ, з якім мы ўстанавілі адносіны сапраўднага супрацоўніцтва і салідарнасці, заснаваныя на імкненні абедзвюх краін да незалежнасці, на смеласці і годнасці нашых народаў, іх рашучасці быць свабоднымі, незалежнымі і антыфашысцкімі. Гэта перакананаўчая і значная перамога, якая дэманструе рэальныя настроі ў Беларусі, якая аднадушна і без ваганняў ізноў выбрала на пасаду Прэзідэнта майго брата Аляксандра Лукашэнку», — гаворыцца ў віншаванні.

* * *

Таксама адбыліся тэлефонныя размовы Аляксандра Лукашэнкі з **Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам, Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым, Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым, Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым, Прэзідэнтам Кыргызстана Садырам Жапаравым.** Акрамя віншаванняў з перамогай на выбарах калегі па СНД абмеркавалі з беларускім лідарам стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін, узаемадзеянне ў інтэграцыйных фарматах.

* * *

Вельмі цёплую сяброўскую размову Прэзідэнт Беларусі правёў з **Першым Прэзідэнтам Казахстана.**

Нурсултан Назарбаеў сардэчна павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах, шчырыя віншаванні і прывітанне ён перадаў і ўсяму беларускаму народу. Аляксандр Лукашэнка таксама цёпла падзякаваў Нурсултану Назарбаеву за добрыя словы і пажаданні.

Дамовіліся беларускі лідар і Першы Прэзідэнт Казахстана і аб тым, што знойдуць у найбліжэйшы час магчымасць сустрэцца і паразмаўляць.

* * *

Паступілі віншаванні і з сяброўскага Пакістана — ад **Прэзідэнта Асіфа Алі Зардары** і **прэм'ер-міністра Шахбаза Шарыфа.** У іх выказана спадзяванне і ўпэўненасць, што пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі двухбаковае супрацоўніцтва будзе і надалей умацоўвацца.

* * *

Павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах Прэзідэнта і **патрыярх Кірыл.** «На працягу дзесяцігоддзяў вы самаддана служыце беларускаму народу, адстойваеце дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы, клапоціцеся аб гарманічным сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, аб умацаванні асноў мірнага і шчаслівага жыцця грамадзян. Прыемна, што ў сваім няпростым служэнні вы нязменна ўдзяляеце вялікую ўвагу духоўна-маральнаму стану грамадства і падтрымцы традыцыйных сямейных каштоўнасцяў», — адзначыў патрыярх. Ён выказаў спадзяванне на далейшае развіццё ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнай улады краіны і Беларускай праваслаўнай царквы.

Віншаванні на імя Прэзідэнта Беларусі працягваюць паступаць.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

«МЫ ГАТОВЫ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ»

Наталля Качанава сустрэлася са старшынёй Нацыянальнага савета правінцый ПАР Рэфілвэ Марыяй Мцвені-Цыпанэ

На словах Старшыні Савета Рэспублікі, адносіны паміж Беларуссю і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай, а таксама ўзаемныя візіты трэба інтэнсіфікаваць.

«І не толькі па парламенцкай лініі. Я ўпэўнена: ваш візіт у нашу краіну надасць новы імпульс нашаму супрацоўніцтву. Мы гатовы супрацоўнічаць абсалютна па ўсіх кірунках: гандлёва-эканамічным, гуманітарным, па лініі парламентаў. І ўсё, што будзе залежаць ад нас, мы для гэтага пастараемся зрабіць», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Сярод перспектыўных Старшыня Савета Рэспублікі назвала развіццё рэгіянальных сувязяў, абмен візітамі дзелавых колаў, пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі на рынкі дзвюх краін, навучанне студэнтаў з ПАР у беларускіх ВНУ, узаемадзеянне ў сферах аховы здароўя, маладзёжнай палітыкі, на ўзроўні жаночых грамадскіх аб'яднанняў.

Па выніках сустрэчы падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным саветам правінцый Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.

Як адзначыў у гутарцы з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргей Алейнік, бакі дамовіліся паглыбіць адносіны. Мемарандум падпісаны ў развіццё пагаднення, якое заключана ў 2007 годзе, і прадугледжвае актыўнае ўзаемадзеянне на міжпарламенцкім узроўні, паміж профільнымі камісіямі, абмен вопытам, падрыхтоўку дарожнай карты з уключэннем у яе канкрэтных праектаў і іншае.

Фота БелТА.

«Мы дамовіліся аб'яднаць намаганні заканадаўчай і выканаўчай галін улады для таго, каб вывесці двухбаковае супрацоўніцтва на якасна новы ўзровень, рэанімаваць існуючыя механізмы ўзаемадзеяння, — сказаў Сяргей Алейнік. — Удзялілі таксама асаблівую ўвагу развіццю міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. У найбліжэйшы час намецім крокі, каб усе галіны Беларусі выйшлі на канкрэтныя праекты эканамічнага, сацыяльна-гуманітарнага супрацоўніцтва з правінцыямі ПАР».

Прадстаўнікі дэлегацыі Нацыянальнага савета правінцый Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі таксама наведалі Мінскі трактарны завод, дзе азнаёміліся з узорамі тэхнікі.

«ПЛЯЦОЎКА ДАСТАТКОВА МАГУТНАЯ»

Ігар Сергяенка сустрэўся са старшынёй Панафрыканскага парламента Фарчунам Чарумбірам

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адзначыў, што цяперашняя сустрэча фактычна прадаўжае дамоўленасці, дасягнутыя ў мінулым годзе.

Дэлегацыя Нацыянальнага сходу выязджала на запрашэнне кіраўніцтва Панафрыканскага парламента для ўдзелу ў сесіі, на якой былі сабраны парламенты 55 краін Афрыкі. «Падчас гэтай паездкі быў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве, і мы прыняты ў якасці назіральніка ў гэту структуру. Гэта дае нам магчымасць развіваць парламенцкія сувязі. Афрыканскія дзяржавы праяўляюць сур'ёзную цікавасць да Беларусі ў плане развіцця не толькі палітычных, але і эканамічных кантактаў. Пляцоўка дастаткова магутная, штаб-кватэра знаходзіцца ў Ёханесбургу, ПАР. Мы будзем мець магчымасць стаць удзельнікамі сесій, якія праводзяцца, і з трыбуны гэтай арганізацыі даводзіць сваю інфармацыю па розных праблемах міжнароднай абстаноўкі і развіваць кантакты з парламентамі тых краін, якія там працуюць. Гэта даволі цікавая структура», — лічыць ён.

Фота БелТА.

На сустрэчы бакі абмяняліся думкамі наконт правядзення выбараў у Беларусі, а таксама абмеркавалі магчымасць узаемадзеяння на міжпарламенцкіх пляцоўках абедзвюх краін.

«Я чакаў, што вынік будзе дастаткова высокі. Перамога ўражальная і прагназаваная. Таму што сёння ўсе жыхары нашай краіны на свае вочы бачаць, як развіваецца Рэспубліка Беларусь, якую ролю адыгрывае нацыянальны лідар Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Гэта, напэўна, самае галоўнае, што вызначыла выбар насельніцтва. І мы бачылі, як актыўна ішло галасаванне і датэрміновае, і ў асноўны дзень», — пракаментаваў журналістам вынікі выбараў Прэзідэнта Беларусі пасля сустрэчы са старшынёй Панафрыканскага парламента Фарчунам Чарумбірам Ігар Сергяенка.

На яго думку, беларусы навучыліся берагчы тое, што маюць, і ацэньваць далейшы шлях развіцця краіны, які складаецца ў тым ліку з паступальнага развіцця эканомікі і павышэння дабрабыту з улікам знешняй абстаноўкі вакол краіны. «Усе зацікаўлены толькі ў тым, каб гарантаваць і бяспеку, і мірнае паступальнае развіццё нашай краіны. Таму я асабіста задаволены вынікамі выбараў», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Паводле БелТА.

З ПАЧУЦЦЁМ АДКАЗНАСЦІ

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАБРАЎ 86,82 % ГАЛАСОЎ

Ігар Карпенка адзначыў, што выбарчая кампанія праведзена ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь у тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам і каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў падрыхтоўкі і правядзення выбараў, зацверджаным ЦВК.

Галасы выбаршчыкаў размеркаваліся наступным чынам. За Алега Гайдукевіча прагаласавала 119 272 чалавекі, або 2,02 %; за Ганну Канапацкую — 109 760 чалавек, або 1,86 %; за Аляксандра Лукашэнку — 5 136 293 чалавекі, або 86,82 %; за Сяргея Сыранкова — 189 740 чалавек, або 3,21 %; за Аляксандра Хіжняка — 102 729 чалавек, або 1,74 %; супраць усіх — 213 277 чалавек, або 3,6 %.

Усяго ж у спісы выбаршчыкаў было ўнесена 6 903 994 чалавекі. Бюлетэні атрымалі 5 916 834 выбаршчыкі, прагаласавалі 5 916 195 чалавек, або 85,69 %.

— Такім чынам, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся, — праінфармаваў Ігар Карпенка, нагадаўшы, што, згодна з заканадаўствам, яны лічацца такімі, калі прагаласавала больш за палову выбаршчыкаў, уключаных у спісы.

У тым ліку свой грамадзянскі абавязак выканалі 114 грамадзян, якія пастаянна жывуць за мяжой і знаходзяцца на консульскім уліку. Права ўпершыню прагаласаваць атрымалі больш за 88 тысяч маладых людзей, і 95 % з іх прыйшлі на выбарчыя участкі.

Нагадаем, у асноўны дзень галасавання ў краіне працавала 5325 выбарчых участкаў, у тым ліку 207 — у бальніцах, санаторыях і дамах адпачынку, 12 — у воінскіх часцях.

— Хачу падзякаваць кандыдатам у Прэзідэнты за правядзенне канкурэнтнай перадвыбарнай кампаніі ў рамках прававога поля. І, вядома ж, трэба выказаць падзяку нашым грамадзянам, якія прынялі актыўны ўдзел у працэсе галасавання, асабліва маладым выбаршчыкам, — адзначыў Ігар Карпенка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПАСТУПІЛА 2200 ЗВАРОТАЎ

Старшыня ЦВК праінфармаваў, што ў інфармацыйна-даведачны цэнтр ЦВК, які з мэтай аператыўнага рэагавання на звароты працаваў з пачатку выбарчай кампаніі, паступіла больш за 2200 вусных зваротаў грамадзян. Супрацоўнікі цэнтра стараліся вырашаць запыты, якія пераважна датычыліся пошуку ўчастка для галасавання, удакладнення звестак аб месцах размяшчэння перадвыбарных праграм кандыдатаў, жадання галасаваць не па месцы рэгістрацыі. Акрамя таго, разглядаліся пісьмовыя звароты, якіх паступіла больш чым сотня. На ўсе з іх былі дадзены вычарпальныя адказы.

Інфармацыя пра ход кампаніі размяшчалася на сайтах ЦВК, мясцовых органаў улады, у сацсетках і месенджарах, асвятлялася ў СМІ. Дзейнічаў інфацэнтр Цэнтрвыбаркама, адкуль трансліраваліся актуальныя даныя пра ход галасавання, працавалі эксперты, нацыянальныя і міжнародныя назіральнікі.

Старшыня ЦВК паведаміў, што былі зафіксаваны факты здзяйснення выбаршчыкамі адміністрацыйных правапарушэнняў — фатаграфаванне запоўненых бюлетэняў для галасавання, а таксама вынасы іх за межы памяшкання для галасавання. Паводле папярэдніх даных, каля 600 бюлетэняў, як мяркуецца, былі вынесены з участкаў для галасавання.

Старшыня ЦВК удакладніў, што ад грамадзян і назіральнікаў не паступала заяў аб парушэнні патрабаванняў выбарчага заканадаўства ў працэсе галасавання ці падліку галасоў, якія б маглі паўплываць на вынікі выбараў.

ЭЛЕКТРОННАЕ ГАЛАСАВАННЕ — НЕ ПАНАЦЭЯ

Ігар Карпенка выказаўся і аб магчымасці ўкаранення ў Беларусі электроннага галасавання.

— Мы глядзім шырэй на гэтую тэматыку, чым выключна электроннае галасаванне. Была створана спецыяльная міжведамасная рабочая група, якая распрацавала канцэпцыю лічбавізацыі выбарчага працэсу. Яна патрабуе яшчэ, вядома, абмеркаванняў з усімі зацікаўленымі, адпаведнага прыняцця і выбудоўвання дарожнай карты яе ўкаранення.

Разам з тым, як адзначыў старшыня ЦВК, электроннае галасаванне — гэта не панацэя:

— Чым больш унікаю ў тэму электроннага галасавання, кантактую з калегамі, у тым ліку расійскімі, тым больш прыходжу да высновы, што электроннае галасаванне — не панацэя. На жаль, сёння тыя, хто мае кнопку кіравання ў інтэрнэце, выкарыстоўваюць гэты механізм для таго, каб уплываць у тым ліку на электроннае галасаванне.

Пры гэтым было б важна зрабіць так званы рэгістр выбаршчыкаў, улічваючы, што рэгістр насельніцтва выкарыстоўваецца ўжо другую кампанію. І гэта дазволіць пазбегнуць шматлікіх пытанняў, калі выбаршчык зарэгістраваны ў адным месцы, а пражывае ў іншым.

— Не выключаю, што пэўныя сэрвісы будуць зроблены. Аднак галоўная ўмова — бяспека, таму праграмны прадукт павінен быць айчынным, а працэсам павінна кіраваць ЦВК ці

«БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА ПАКАЗВАЕ ЎСІМ ПРЫКЛАД, ЯК ТРЭБА РАЗВІВАЦЦА НА ВЫБРАНЫМ ШЛЯХУ»

Незалежныя назіральнікі — аб прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі

Дырэктар па рэгіянальных выбарах Рэспублікі Філіпіны Марыя Хуна С. ВАЛЕСА:

— З 24 да 26 студзеня мы свабодна ажыццяўлялі назіранне за працэдурай выбараў і гутарылі з членамі выбарчых камісій. Магу сказаць, што ўсё, што я чытала або глядзела ў навінах пра Беларусь да гэтага, поўнасцю не адпавядае таму, што я ўбачыла. У процівагу таму, што пішуць аб дэмакратыі ў вашай краіне, яна тут цалкам квітнее. Выбары ў Беларусі прайшлі ў мірнай і спакойнай манеры. Мяне ўразіла некалькі момантаў. І першы з іх — правядзенне датэрміновага галасавання. Гэта пахвальная ініцыятыва, паколькі ў грамадзян краіны ёсць магчымасць прагаласаваць тады, калі ім зручна. Такую практыку мы збіраемся ў вас запазычыць. Выбары інклюзіўныя: кожны галасуючы мае доступ да выбарчага працэсу. Акрамя таго, доступ да галасавання таксама мелі некаторыя катэгорыі асоб: напрыклад, тыя, хто чакае прыгавору, а таксама грамадзяне, якія пастаянна пражываюць за мяжой. Наяўнасць нацыянальных назіральнікаў на кожным участку для галасавання аказалася вельмі эфектыўнай практыкай, якая ўнесла ўклад у транспарэнтнасць выбараў. Віншую народ Беларусі з тым, што вам удалося абараніць дэмакратычныя выбары ў сваёй краіне!

Старшыня Венгерскай рабочай партыі Дзюла ЦЮРМЕР:

— Сёння мы віншуем беларускі народ з перамогай. І калі мы адзначаем дзень перамогі, можа, недарэчна казаць аб тым, што было пяць гадоў таму. Але калі мы не ўспомнім падзеі 2020 года, то тады не зразумеем рашэння беларускага народа. Пяць гадоў таму некаторыя беларусы думалі, што трэба прапанаваць іншы шлях развіцця, падпарадкавацца Захаду, правесці прыватызацыю дзяржаўнай прамысловасці, прадаць усё каштоўнае, што ёсць у беларускага народа, раскалоць беларускае грамадства і ўвесці Беларусь у вайну супраць Усходу, супраць Расіі. Але, дзякуй богу, была іншая альтэрнатыва — захаваць суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, развіваць нацыянальную эканоміку, абараняць нацыянальныя набыткі беларускага народа, абапірацца на сяброўскія саюзніцкія сувязі з Расіяй, захаваць мір і любой цаной пазбегнуць таго, каб Беларусь была ўцягнута ў вайну на Украіне. Віншуючы беларускі народ, мы віншуем і пераможцу выбараў — Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку. Але не толькі нашы беларускія сябры, і ўсе мы павінны быць удзячныя яму за тое, што без яго мудрасці, дальнабачнасці, без яго храбрасці, думаю, што і Беларусь, і Усходняя Еўропа, уключаючы Венгрыю, былі б абсалютна ў іншым становішчы. Тады б вайна ішла не толькі на тэрыторыі Украіны, а даўно б пайшла далей. Мы яму ўдзячныя за гэта. Учора, калі Еўрапейскі саюз вырашыў прыняць сумесную заяву, асуджаючы Беларусь за выбары, венгерскі ўрад і спадар Орбан быў адзіным, хто не падпісаў гэтую заяву. Мы заклікаем нашых суайчыннікаў аказваць далейшую дапамогу беларускаму народу, каб захавалі мір, каб далей паспяхова пайшлі па тым шляху, які сваім рашэннем пацвердзіў беларускі народ.

Генеральны сакратар партыі «Салідарнасць у імя міру» (Грузія) Цемур ПІПІЯ:

— Выбары паказалі выключную згуртаванасць грамадскасці Беларусі ва ўмовах беспрэцэдэнтнага міжнароднага ціску і той сітуацыі, якая складваецца вакол вашай краіны. Тое, што беларускаму грамадству ў гэтых найцяжэйшых умовах удалося правесці такія цудоўна арганізаваныя выбары, якія прайшлі ў спакойнай абстаноўцы, каторы раз пацвярджае, што беларускае грамадства з'яўляецца сапраўды выключным і паказвае ўсім прыклад, як трэба трымацца, дасягаць суверэнітэту, незалежнасці і развівацца па выбраным шляху.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

«АБНОЎЛЕНАЯ ЗАБЯСПЕЧЫЛА СУВЕРЭНІТЭТУ»

Гэта найбольш шматлікая міжнародная місія, якая ажыццяўляла назіранне за выбарамі Прэзідэнта Беларусі. У склад місіі ўваходзілі 296 прадстаўнікоў з сямі дзяржаў Садружнасці. На працягу датэрміновага галасавання і ў асноўны дзень выбараў назіральнікі ад місіі СНД наведалі 2383 выбарчыя ўчасткі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Ажыццяўляць маніторынгавую дзейнасць у нашай краіне місія ад СНД пачала 19 снежня. За паўтара месяца работы назіральнікі мелі добрую магчымасць назіраць за падрыхтоўкай да выбараў, за правядзенне датэрміновага галасавання і галасавання ў асноўны дзень, што дазволіла даць аб'ектыўную ацэнку галоўнай электаральнай падзеі ў Беларусі.

Каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад Парламенцкай асамблеі АДКБ, намеснік Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай федэрацыі Вікторыя АБРАМЧАНКА адзначыла, што ўдзел у выбарчай кампаніі пяці кандыдатаў забяспечыў спаборніцкі характар выбараў і даў выбаршчыкам рэальную магчымасць зрабіць усвядомлены выбар. «Цэнтральная выбарчая камісія і сродкі масавай інфармацыі далі грамадзянам Беларусі ўсю неабходную інфармацыю аб кандыдатах і іх перадвыбарных праграмах, — удакладніла яна. — Перадвыбарная агітацыя праходзіла ў адпаведнасці з заканадаўствам і не парушала правы ўдзельнікаў выбарчага працэсу».

І ВЫСОКАЙ ЯЎКАЙ

падведамасныя ёй арганізацыі. Гэта павінна быць незалежная нацыянальная сістэма, — падкрэсліў Ігар Карпенка.

«ГРАМАДЗЯНЕ Ў КРАІНАХ ЗАХАДУ ЗАЙМАЮЦЬ ІНШЫЯ ПАЗІЦЫІ, ЧЫМ ІХ ЭЛІТЫ»

На выбарах Прэзідэнта прысутнічала амаль паўтысячы міжнародных назіральнікаў. Адказваючы на пытанне пра запрашэнне ў такой ролі прадстаўнікоў з краін Захаду, Ігар Карпенка патлумачыў, што звычайныя грамадзяне ў гэтых краінах займаюць іншыя пазіцыі, чым іх улады.

— Мы дакладна падзяляем палітычныя эліты ў гэтых краінах і простых грамадзян. Перакананы, што ў простых грамадзян у Еўропе, у першую чаргу нашых найбліжэйшых суседзяў у Польшчы, Украіне, Прыбалтыйскіх дзяржавах, у пераважнай большасці зусім іншыя пазіцыі, падыходы, меркаванні. Гэтым палітычным элітам давядзецца трымаць пэўны адказ перад сваімі грамадзянамі.

У якасці прыкладу старшыня ЦВК прывёў Вялікабрытанію, дзе «ідзе чахарда» з прэм'ер-міністрамі.

— Грамадзяне ўсё бачаць. Прыехалі сяброўскія нашай краіне людзі, якія добра да нас ставяцца. Мы ж не запрашалі гэту Каю Калас (кіраўнік еўрадыпламатыі). Мы ведаем яе русафобскія і антыбеларускія падыходы. Няхай займаецца сваімі справамі. Што ад таго, што яна сказала, што не прызнае выбары ў Беларусі? Мне ад гэтага ні горача ні холадна, я мяркую, гэтак жа, як і нашым грамадзянам, — дадаў Ігар Карпенка.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Тым часам

Парушэнняў заканадаўства не выяўлена

У Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі за час яго работы паступіла 450 зваротаў. Падчас датэрміновага галасавання і ў асноўны дзень выбараў за імі сачыла каля 44 тысяч назіральнікаў, у тым ліку 35 тысяч прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Парушэнняў заканадаўства, якія б уплывалі на вынікі галасавання, нацыянальныя назіральнікі не выявілі.

Як расказаў **намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Андрэй БАСАК**, уся інфармацыя паступала ў цэнтр у рэжыме рэальнага часу. Асаблівую ўвагу назіральнікі звярталі на своечасовасць адкрыцця выбарчых участкаў, правільнасць апячатвання скрыняў для галасавання, выдачу бюлетэняў, галасаванне дома і падлік галасоў.

Як паведаміў **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Вадзім ГРАЧОЎ**, падчас работы ў цэнтр паступіла каля 450 зваротаў грамадзян. У абсалютнай большасці выпадкаў людзям патрабаваліся кансультацыя і тлумачэнне, як дзейнічаць у той ці іншай сітуацыі. Напрыклад, як арганізаваць галасаванне дома, па якіх дакументах можна прагаласаваць, ці можна рабіць фота на ўчастку. Па ўсіх пытаннях заяўнікі атрымалі аператыўныя тлумачэнні.

У цэлым ніводнага факта, які б указваў на парушэнне заканадаўства пры арганізацыі галасавання або паставіў пад сумненне яго вынік, у Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі не паступіла, рэзюмаваў Вадзім Грачоў.

МАДЭЛЬ ВЫБАРАЎ АБАРОНУ ЭЛЕКТАРАЛЬНАГА

Місія назіральнікаў ад СНД дала высокую ацэнку выбарам

Вікторыя Абрамчанка ўказала на тое, што назіральнікі ад палітычных партый кандыдатаў мелі ўсе ўмовы для выканання сваіх функцый, што, па яе словах, сведчыць аб адкрытасці выбарчага працэсу.

«Выбары былі адзначаны беспрэцэдэнтна шырокім і масавым удзелам грамадскіх назіральнікаў — звыш 44 тысяч нацыянальных назіральнікаў назірала за выбарамі кіраўніка дзяржавы, — удакладніла каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад Парламенцкай асамблеі АДКБ. — У ходзе галасавання было забяспечана свабоднае волевыяўленне выбаршчыкаў. Актыўнасць на выбарчых участках была высокай, а атмасфера — дружалюбнай і пазітыўнай, што пацвярджае зацікаўленасць і адказнасць арганізатараў і ўдзельнікаў выбарчага працэсу».

Вікторыя Абрамчанка падкрэсліла: «Абноўленая мадэль выбараў у Беларусі забяспечыла абарону электаральнага суверэнітэту, выкананне інтарэсаў усіх удзельнікаў і садзейнічала далейшай актывізацыі грамадзянскай супольнасці».

Па яе словах, адкрытасць і галоснасць выбараў пацвярджалася вялікай колькасцю міжнародных назіральнікаў і прадстаўнікоў замежных СМІ. «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся, былі дэмакратычнымі, канкурэнтнымі, празрыстымі, прамымі, сапраўднымі, галоснымі, свабоднымі і справядлівымі», — рэзюмавала каардынатар групы міжнародных назіральнікаў ад ПА АДКБ.

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Кыргызскай Рэспублікі Нуржан ШАЙЛДАБЕКАВА звярнула ўвагу на тое, што падчас прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі былі прыняты меры даступнасці галасавання для ўсіх катэгорый выбаршчыкаў. «Для асоб з абмежаванымі магчымасцямі, для тых, хто часова пражывае за мяжой, — патлумачыла яна. — Пры гэтым мы лічым важнымі меры па арганізацыі датэрміновага галасавання, што істотна пашырыла магчымасці ўдзельнічаць у галасаванні для ўсіх выбаршчыкаў».

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Кыргызстана адзначыла сур'ёзны ўдзел моладзі ў выбарах. «Тыя меры, якія былі прыняты, садзейнічалі ўсвядомленаму і актыўнаму ўдзелу моладзі ў выбарах», — удакладніла яна.

Міжнародны назіральнік звярнула ўвагу і на шырокія меры па інфармаванні выбаршчыкаў, правядзенне агітацыйнай кампаніі. Па яе словах, роўныя ўмовы першапачаткова былі створаны для ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты. «Увесь комплекс прынятых з боку дзяржавы і Цэнтральнай выбарчай камісіі мер поўнасцю адпавядае стандартам, прынцыпам, нормам, якія ўстаноўлены для ажыццяўлення дэмакратычных свабодных выбараў», — падкрэсліла Нуржан Шайлдабекава.

Намеснік Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Канстанцін КАСАЧОЎ, каардынатар групы назіральнікаў ад Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, паведаміў, што ўдзельнікі групы падчас выбараў наведалі 321 участак. «Наша назіранне было не толькі палітычным, але і нават навуковым: была магчымасць у тым ліку праводзіць параўнальны аналіз найлепшай практыкі і фарміраваць высновы на аснове прафесійных навуковых вышукаў», — патлумачыў ён.

Каардынатар групы назіральнікаў ад МПА СНД канстатаваў, што выбары ў Беларусі былі праведзены пры выкананні правоў і свабод усіх удзельнікаў выбарчага працэсу ў адпаведнасці з нормамі нацыянальнага заканадаўства і міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь у электаральнай сферы.

«АБСТАНОЎКА НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ СТАПРАЦЭНТНА АДПАВЯДАЛА ЎСІМ МІЖНАРОДНЫМ СТАНДАРТАМ»

Аб гэтым аднагалосна заявілі міжнародныя назіральнікі ад Панафрыканскага парламента

Кіраўнік дэлегацыі старшыня Панафрыканскага парламента Фарчун Зэфанія ЧАРУМБІРА выказаў удзячнасць за запрашэнне назіраць за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі. Місія назіральнікаў Панафрыканскага парламента ўпершыню ажыццяўляла назіральніцкую функцыю за электаральнай кампаніяй у нашай краіне.

«Мы ўпершыню знаходзімся і назіраем за выбарамі ва Усходняй Еўропе, у гэтай частцы свету мы не былі ніколі, — удакладніў ён. — Беларусы — вы першыя, хто праявіў такую ступень адкрытасці і запрасіў Панафрыканскі парламент».

Фарчун Зэфанія Чарумбіра паведаміў, што, перш чым прадстаўнікі міжнароднай місіі накіраваліся на ўчасткі для назірання, яны вывучылі нашы дакументы — Канстытуцыю і Выбарчы кодэкс. «Ваш Выбарчы кодэкс карэлюе з кодэксамі ва ўсім свеце», — канстатаваў кіраўнік місіі ад Панафрыканскага парламента. — Мы маем доступ да гэтай дакументацыі, таму можам рабіць высновы».

Першае, на што звярнулі ўвагу прадстаўнікі Панафрыканскага парламента, наведваючы выбарчыя ўчасткі, — гэта атмасфера як унутры, так і звонку ўчасткаў. «Атмасфера на вашых выбарчых участках была поўнасцю спакойная, — удакладніў кіраўнік місіі. — Людзі спакойна аддавалі свой голас. Усё праходзіла вельмі мірна. Мы лічым, што абстаноўка на выбарчых участках стапрацэнтна адпавядала ўсім міжнародным стандартам».

Фарчун Зэфанія Чарумбіра ўказаў на важнасць празрыстых скрынь, куды выбаршчыкі апускалі бюлетэні для галасавання. «Унікальная асаблівасць, якая дэманструе, што вашы выбары дэмакратычныя і інклюзіўныя, — гэта наяўнасць пераносных скрынь, што выкарыстоўваюцца людзьмі, якія маюць пэўныя складанасці з тым, каб дабрацца да выбарчага ўчастка (у большасці краін, дзе мы былі, такіх скрынь няма), — дадаў ён. — Тое, што такія скрыні ёсць у вас, сведчыць аб тым, што ніхто не застаецца ўбаку, што ўсе могуць выказаць сваё меркаванне свабодна».

Уразіла назіральнікаў ад Панафрыканскага парламента і тое, што на ўсіх выбарчых участках працавала большасць жанчын. «А жанчыны, як мы ведаем, унушаюць давер», — удакладніў кіраўнік місіі.

Фарчун Зэфанія Чарумбіра падкрэсліў, што выбары ў Беларусі праходзілі ў вельмі бяспечнай абстаноўцы. «Мы звярнулі ўвагу, што людзі, якія прыходзілі на выбарчыя ўчасткі, не адчувалі ніякіх пагроз, мірна галасавалі, — канкрэтызаваў ён. — Мы былі сведкамі, калі на ўчастку прыходзілі цэлыя сем'і, у тым ліку з маленькімі дзецьмі. Людзі не пойдуць на ўчастку з дзецьмі, калі чакаюць пэўнай пагрозы. Значыць, яны верылі, што ўсё пройдзе ў поўнай бяспецы».

Рэзюмуючы, старшыня Панафрыканскага парламента падкрэсліў: «Мы, як арганізацыя, якая большая, чым Еўрапарламент (у Панафрыканскі парламент уваходзіць 55 краін. — «Зв».) аднагалосна заяўляем, што вашы выбары былі свабодныя, справядлівыя, законныя, дэмакратычныя і адпавядалі ўсім патрабаванням заканадаўства. Мы жадаем народу Беларусі пад кіраўніцтвам Прэзідэнта быць адзінымі і рухацца наперад, стымуляваць развіццё краіны».

Вераніка КАНЮТА.

«АДНОСІНЫ ДА ГЭТАГА ВАЖНАГА МЕРАПРЫЕМСТВА Ў КРАІНЕ СВЕДЧАЦЬ АБ КАНСАЛІДАЦЫІ ГРАМАДСТВА»

ШАС прызнае выбары ў Беларусі празрыстымі, дакладнымі і дэмакратычнымі

Місія назіральнікаў ад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ўпершыню прымала ўдзел у назіранні за выбарамі ў Беларусі. У складзе місіі, якая працавала на выбарчых участках на працягу пяці дзён, за выбарамі назіралі 17 прадстаўнікоў з сямі дзяржаў — членаў ШАС. За час работы міжнародныя назіральнікі наведалі 109 выбарчых участкаў.

Члены місіі адзначылі актыўны ўдзел грамадзян у галасаванні і ўказалі на высокі прафесійны ўзровень падрыхтоўкі супрацоўнікаў участковых выбарчых камісій. Дзейнасць выбарчых камісій насіла вельмі галосны, кваліфікаваны і незалежны характар. **Кіраўнік місіі назіральнікаў ад ШАС, Генеральны сакратар ШАС Нурлан ЕРМЕКБАЕЎ адзначыў:** «Мы заўважылі высокую актыўнасць моладзі. Галасаванне ўсюды праходзіла спакойна, у рамках устаноўленага парадку ў прысутнасці прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі».

Як было адзначана, выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адпавядалі патрабаванням выбарчага заканадаўства нашай краіны, міжнародным абавязацельствам, прынятым Беларуссю.

Парушэнняў норм нацыянальнага заканадаўства, якія ставілі б пад сумненне легітымнасць выбараў і якія маглі аказаць уплыў на вынікі выбараў, місіяй не адзначана. Місія прызнае выбары, якія адбыліся, празрыстымі, дакладнымі і дэмакратычнымі.

Міжнародны назіральнік ад місіі ШАС Антон ЛАПАЦІН звярнуў увагу на прафесійную падрыхтоўку членаў выбарчых камісій усіх узроўняў, настрой людзей, іх актыўнасць падчас выбараў. «Адносіны да гэтага важнага мерапрыемства ў краіне сведчаць аб кансалідацыі грамадства, — падкрэсліў ён. — Вынікі, агучаныя Цэнтральнай выбарчай камісіяй Беларусі, можна пацвердзіць высокім духоўным настроем».

Па словах міжнароднага назіральніка, выбарчыя правы ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу ў нашай краіне былі забяспечаны ў поўным аб'ёме. «У дакладнай адпаведнасці з дзеючай Канстытуцыяй, дзеючым Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, — канкрэтызаваў ён. — Выбары, якія адбыліся, пацвердзілі той курс, якім жыве рэспубліка».

Вераніка КАНЮТА.

МЕРКАВАННІ

Назіральнік з Кыргызскай Рэспублікі:

«ГЭТЫ ДЗЕНЬ — ЯК СВЯТА»

Міжнародны назіральнік з Кыргызскай Рэспублікі Санжар МУКАНБЕТАЎ выказаў сваё меркаванне адносна правядзення выбараў Прэзідэнта Беларусі.

«Для мяне гэта першы вопыт работы ў якасці міжнароднага назіральніка на выбарах Прэзідэнта. Учора наведалі каля шасці выбарчых участкаў. Усё праходзіць спакойна, у дружалюбнай атмасферы. Сённяшні дзень адчуваецца як свята. Людзі прыходзяць, рэалізуюць сваё выбарчае права. Што хацелася б асабліва адзначыць — гэта магчымасць правядзення датэрміновых выбараў у Беларусі. Ахоп грамадзян літаральна максімальны. Гэта той вопыт, які хацелася б пераняць», — адзначыў Санжар Турдукажоевіч.

Назіральнік з Турцыі:

«ВЫБАРЫ АРГАНІЗАВАНЫ СІСТЭМАТЫЧНА, ЗЛАДЖАНА»

Карэспандэнт інтэрнэт-партала ODA TV (Турцыя) Окай ДЭПРЭМ у інфацэнтры Цэнтральнай выбарчай камісіі расказаў, што ў Беларусі бываў неаднаразова. На гэты раз ён прыехаў у Мінск у якасці эксперта па назіранні за выбарамі Прэзідэнта:

«Маштабы выбараў Прэзідэнта ўражваюць. Яны арганізаваны сістэматычна, зладжана. Я да гэтага моманту не сутыкнуўся ні з адной складанасцю», — адзначыў карэспандэнт.

Што датычыцца асвятлення выбараў у медыя і працы беларускіх журналістаў, Окай Дэпрэм адзначыў, што не першы раз узаемадзейнічае з беларускімі калегамі:

«У Беларусі дастаткова добра развітыя традыцыі, інфраструктура, база журналістыкі. Я заўважыў, што ў вас актыўна задзейнічаны і радыё, і тэлебачанне, і друкаваныя СМІ, і сайты па асвятленні выбараў. Журналісты прафесійныя, добра падрыхтаваныя. І гэта ўсё невыпадкова».

Назіральнік з Сербіі:

« У БЕЛАРУСІ ЎСЁ РОБІЦЦА ДЛЯ ЧАЛАВЕКА»

Дэпутат парламента Сербіі Драган СТАНАЕВІЧ наведвае нашу краіну ў чацвёрты раз, цяпер — у якасці міжнароднага назіральніка. Некаторыя яго калегі прыехалі ў Беларусь упершыню.

«Кожны раз у мяне незабыўныя ўражанні, а мае калегі, якія раней не былі, проста ў прыемным шоку — ад Беларусі, ад таго, як тут усё ўладкавана. Вельмі ўражвае Мінск — наколькі ўсё тут зроблена для людзей, пачынаючы ад вуліц і дамоў. Вы такога ў Еўропе не ўбачыце — ёсць кварталы, дзе ўсё зіхаціць, а ёсць тыя, дзе «зіхаціць» сапраўдная галеча. У вас іншая сітуацыя, дзе ўсё — для людзей. Акрамя таго, уражвае, наколькі тут дамашняя прадукцыя. Калі апынуліся ў Беларусі, першае, што я купіў, — кефір, бо ён сапраўдны, са знакам якасці. Я жыў і ва Украіне, і ў Расіі і бачу, як беларусы пільна да ўсяго ставяцца. Нідзе няма такой якасці, не толькі да прадуктаў, а да ўсяго — да вытворчасці, да людзей».

Рэзалюцыю Еўрапарламента з патрабаваннем непрызнання выбараў Прэзідэнта ў Беларусі Драган Станаевіч назваў умяшаннем у справы незалежнай краіны:

«Уся іх палітыка зводзіцца да таго, што яны ўмешваюцца ва ўнутраныя справы дзяржавы. Яны і прэзідэнта вам «выбіраюць» — напэўна, у вас ёсць яшчэ нейкі прэзідэнт, праўда, яго выбраў не народ, а яны. Гэта — іх дэмакратыя: яны каго захацелі, выбралі, а народ ніхто не пытае. Мы на сабе адчулі іх дэмакратыю ў 1999 годзе, калі бомбы НАТА ляцелі па ўсёй Сербіі, калі забівалі дзяцей і знішчалі інфраструктуру».

Назіральнік з Аўстрыі:

«МЫ НЕ ФІКСАВАЛІ ЯКІЯ-НЕБУДЗЬ ПАРУШЭННІ»

Для таго каб нешта крытыкаваць, неабходна спачатку ўсё ўбачыць на месцы. Аб гэтым заявіў **міжнародны назіральнік з Аўстрыйскай Рэспублікі Хэндлэр КЛАУС.** У цэлым, па яго словах, кампанія на выбарах Прэзідэнта Беларусі амаль нічым не адрозніваецца ад аўстрыйскай.

«Мы вельмы ўдзячны беларускаму боку за запрашэнне. Першае ўражанне вельмі станоўчае, у вас добрая краіна. А для таго каб нешта крытыкаваць, неабходна спачатку ўсё ўбачыць на месцы, на свае вочы. Спачатку трэба прыехаць, паглядзець, а потым ужо рабіць высновы. Мы ўжо наведалі некалькі выбарчых участкаў, і ўсё, што там адбываецца, — адбываецца роўна гэтак жа, як і ў Аўстрыі. Усё арганізавана добра, і нейкай крытыкі, нейкіх заўваг у нас няма».

Замежны назіральнік адзначыў, што ў іх была добрая магчымасць наведаць выбарчыя ўчасткі і ўбачыць працэс датэрміновага галасавання:

— І казаць, што людзі прыходзяць пад нейкім ціскам, ці пра тое, што гэтае галасаванне штучна арганізаванае, — мы не можам, бо людзі прыходзяць масава. На адных участках больш, на іншых участках менш людзей, але ўсё гэта адбываецца нармальна і натуральна. Людзі атрымліваюць бюлетэні, аддаюць свае галасы за любога з кандыдатаў — у цэлым усё тут адбываецца, як і ў Аўстрыі. Ёсць, вядома, некаторыя адрозненні ў выбарчых заканадаўствах нашых краін, але пры гэтым усё ў парадку. Пакуль мы не фіксавалі якія-небудзь парушэнні, ціск ці нейкую штучную арганізацыю. Усё адбываецца нармальна. Вядома, неабходна разумець, што асобнаму чалавеку цяжка ацаніць увесь працэс. Але зараз мы гаворым пра тое, што я бачыў на свае вочы, наведваючы выбарчыя ўчасткі вашай краіны. І тое, што я сам бачыў, абсалютна не выклікае негатыўных ацэнак.

Па паведамленнях нашых карэспандэнтаў.

КАНТЭКСТ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Не смяшыце людзей. Я ведаю, як гэты мітынг рыхтаваўся. Няма там мітынгу, таму што прыпынена фінансаванне (з боку ЗША пасля ўступлення на пасаду новага прэзідэнта. — Заўв. Рэд.), Трамп не даў грошы.

Усё, што вы сказалі (пра шматтысячны мітынг у Варшаве і матывацыю людзей прыйсці на яго. — Заўв. Рэд.), — гэта хлусня.

Падчас адказаў на пытанні журналістаў, якія асвятлялі прэзідэнцкія выбары, 26 студзеня 2025 г.

«КАЛІ ВЫ ДУРНІ, ІДЗІЦЕ!»

Аляксандр Лукашэнка падчас размовы з журналістамі пасля галасавання на сваім выбарчым участку расказаў, як збеглыя рыхтавалі «недамітынг» у Варшаве ў дзень выбараў. У прыватнасці, адказваючы на пытанне прадстаўніка французскага інфармагенцтва, беларускі лідар паведаміў, што ад кампетэнтных органаў яму паступала інфармацыя аб тым, як рыхтавалася акцыя ў суседняй сталіцы і што там цэлая бойка адбывалася: адны казалі, што не атрымаецца сабраць нават тысячу чалавек, таму і збірацца не варта, а іншыя ўсё роўна настойвалі.

Дык як жа выглядалі на самай справе шырока ананса-ваныя апазіцыяй (а дакладней — купкай псеўдапалітычных дзеячаў) акцыі?

У літоўскай сталіцы на двухгадзінную тусоўку сабралася не больш за 40 чалавек — прыхільнікаў «перамен», пастаялі, патапталіся, паспачувалі адно аднаму, маўляў, вось яны, перамены, за якія так змагаліся...

У польскай сталіцы на дату нашых выбараў быў заяўлены цэлы марш з вынасам экстрэмісцкага палотнішча па цэнтральных вуліцах Варшавы (ці ж жартачкі вам, цэлы «офіс» у ліку арганізатараў). Атрымалася такое сабе відовішча: з заяўленых тысяч удзельнікаў ад сілы набралася з тры сотні, цягалі бчб-анучу як труну з нябожчыкам. Па сутнасці, сэнс той жа. Пара б развітацца і закапаць. А апафеозам гэтага дзейства стаў форум «Беларусы вартыя лепшага», у якім прыняло ўдзел усяго 70 чалавек. Ды ўжо моц, вядома... Мабыць, гэта тыя, хто застаўся на памінкі. Памянулі сваё нядрэннае, скажам прама, ранейшае жыццё ў роднай краіне і пайшлі далей гнуць спіну на паноў — жыць жа неяк трэба.

Аповед пра акцыі ў Варшаве будзе няпоўным, калі не згадаць пра яшчэ адну, арганізатарам якой выступіў «патрыярх» з усім нязгодных — дзед Зянон. Дык вось на пікеце (дзе, дарэчы, былі заўважаны і сцягі Украіны, Польшчы і ЗША) засвяцілася каля 20 чалавек.

Пайшлі далей. У Бруселі — сэрцы еўрадэмакратыі — на акцыю насупраць беларускага дыппрадстаўніцтва сабралася цэлых 15 чалавек. У нямецкім Кёльне выказалі сваю нязгоду з нашым з вамі выбарам прыкладна столькі ж неверагодных, у аўстралійскай Канберы — 10, у Лондане — каля 10, столькі ж у польскім Любліне. Карацей, не густа...

На ўзроўні арыфметычнай хібнасці «пратэсты» (калі іх можна так назваць нават у двукоссі) засвяціліся ў эстонскім Таліне і швейцарскай Жэневе — у абедзвюх лакацыях прысутнічалі па два чалавекі.

Усяго ж у анансаваных (ого-го колькі нас: тысячы, мільёны!) акцыях па ўсім свеце прынялі ўдзел (увага на лічбу) — 581 (!) чалавек. Прычым сярод іх былі не толькі нашы збеглыя, але і грамадзяне тых краін знаходжання.

І вось паглумліцца б з неверагодных з іх «калёнамі», але нават іх неяк шкада, убогіх... Ім там так карціць, што на радзіме справы без іх ідуць больш чым выдатна. Краіна развіваецца, прыгажэе на вачах, дадае ў эканамічным патэнцыяле, а яе жыхары, нарэшце, усвядомілі ўсю каштоўнасць таго, што дасягнута за апошнія дзесяцігоддзі стваральнага развіцця. За працяг гэтага курсу амаль 6 мільёнаў беларусаў аддалі свае галасы 26 студзеня. Яны зрабілі свой выбар, як, уласна, і няпоўных шэсць сотняў, што выйшлі выказаць сваю нязгоду. Або зайздрасць, што нам з вамі на радзіме добра жывецца. Або злосць, што ім так не жыць...

Словам, хай сабе брэшуць — караван ідзе!

«МЫ ДЗВЕРЫ НЕ ЗАЧЫНЯЕМ»

КАРАНКЕВІЧ — аб уключэнні ў сетку першага энергаблока АЭС і гатоўнасці Беларусі да выхаду краін Балтыі з БРЭЛЛ

Намеснік прэм'ер-міністра Віктар Каранкевіч расказаў аб рэгламентных работах, якія праводзіліся на БелАЭС, і наступствах выхаду краін Балтыі з электрычнага кольца Беларусь — Расія — Эстонія — Латвія — Літва (БРЭЛЛ).

— Па першым энергаблоку завершаны планава-папераджальны рамонт, і ў 9.53, 27 студзеня, блок уключаны ў сетку, — паведаміў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Віктар Каранкевіч.

Ён адзначыў, што ў рамках планава-папераджальнага рамонту былі выкананы ўсе прадугледжаныя праграмай работы:

— Гэта дыягностыка, тэхнічнае абслугоўванне абсталявання, тэхналагічных сістэм, эксплуатацыйны кантроль металаабсталявання і трубаправодаў.

Профільны віцэ-прэм'ер дадаў, што цяпер ажыццяўляецца рэгламентнае паэтапнае павелічэнне магутнасці на першым энергаблоку.

— Другі энергаблок працуе ў штатным рэжыме на намінальнай магутнасці і нясе нагрузку 1170 мегават, — дадаў ён.

Таксама Віктар Каранкевіч расказаў, што Беларусь гатовая да выхаду краін Балтыі з БРЭЛЛ, энергасістэма будзе працаваць надзейна.

Нагадаем, што энергасістэмамі краін Балтыі заяўлена дэсінхранізацыя ад Аб'яднанай энергасістэмы Беларусі і адзінай энергетычнай сістэмы Расіі. Плануецца адключэнне ўсіх міждзяржаўных ліній сувязі і спыненне паралельнай дзейнасці ў складзе электрычнага кола Беларусь — Расія — Эстонія — Латвія — Літва (БРЭЛЛ).

— У цяперашні час беларуская энергасістэма працуе ў сінхронным коле БРЭЛЛ. Беларусь з'яўляецца надзейным партнёрам, у свой час забяспечвала пастаўкі электраэнергіі ў краіны Балтыі пры наяўнасці патрэбы ў рамках заключаных дагавораў, у тым ліку ажыццяўлялася аварыйная ўзаемадапамога асобным краінам у асобныя перыяды. Электраэнергія пастаўлялася ў неабходных аб'ёмах у выпадку пазаштатных сітуацый, — нагадаў Віктар Каранкевіч і адзначыў, што Беларусь у рамках кольца БРЭЛЛ з'яўляецца гарантам транзіту электраэнергіі, забяспечвае надзейнасць адпаведных ператокаў.

Варта сказаць, што аб выхадзе краін Балтыі з БРЭЛЛ было вядома загадзя, і наша краіна прыняла комплекс мер па забеспячэнні надзейнай паралельнай работы з Расійскай энергасістэмай.

Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра, былі праведзены адпаведныя работы і на лініях электраперадач, на падстанцыях:

— Мы гатовыя да гэтага. Беларуская энергасістэма будзе забяспечваць стабільную, надзейную работу ў сінхранізацыі і ў паралельнай рабоце з Расійскай энергасістэмай.

Ён таксама дадаў, што краіны Балтыі выдаткавалі на рэалізацыю мерапрыемстваў па выхадзе з БРЭЛЛ значныя капітальныя ўкладанні:

— У сувязі з гэтым магчыма павелічэнне тарыфаў для спажыўцоў у гэтых краінах. Але гэта іх рашэнне, яны зрабілі свой выбар.

Адказваючы на пытанне, калі краіны Балтыі захочуць вярнуцца назад, профільны віцэ-прэм'ер растлумачыў:

— Мы, вядома, гатовыя будзем забяспечыць работу ў коле БРЭЛЛ сінхронна з краінамі Балтыі. Мы дзверы не зачыняем. Беларуская энергасістэма заўсёды гатовая разам з краінамі-суседзямі забяспечыць надзейнае функцыянаванне энергасістэм, а ў выпадку неабходнасці — і пастаўку электраэнергіі ў запатрабаваных аб'ёмах у гэтыя краіны.

Як адзначыў Віктар Каранкевіч, на сёння камерцыйных паставак няма, разам з тым дадаў:

— Але мы знаходзімся ў паралельнай дзейнасці. Гэта значыць, што ідзе агульнае перамяшчэнне энергіі ў рамках кольца БРЭЛЛ.

ЖЫЛЛЁ Ў ЗОНЕ ДОСТУПУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як вядома, 1 студзеня ўступіў у дзеянне Указ Прэзідэнта ад 29 жніўня 2024 года № 344 «Аб субсідзіраванні юрыдычных асоб пры ўзвядзенні або набыцці жылых памяшканняў», якім прадугледжаны дадатковыя крыніцы фінансавання будаўніцтва і пакупкі арэнднага жылля.

«Раней асноўнай крыніцай фінансавання ўзвядзення арэнднага жылля з'яўляліся бюджэтныя сродкі. Нягледзячы на тое, што за апошнія пяць гадоў аб'ёмы ўзвядзення арэнднага жылля за кошт бюджэтных сродкаў павялічыліся ўтрая, попыт на такое жыллё ў разы перавышае яго прапанову», — адзначылі ў Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва. У Мінбудархітэктуры нагадалі, што парадак выдзялення арэнднага жылля, у тым ліку катэгорыям грамадзян, якія маюць права на яго першачарговае атрыманне, замацаваны ў Жыллёвым кодэксе.

«Указ пасадзейнічае замацаванню кадраў»

Ігар СЯРГЕЕЎ, член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар ААТ «Беларускі цэментны завод»:

— Дынаміка зададзена на тое, каб на месцах у рэгіёнах, дзе запатрабаваны спецыялісты і ёсць вакансіі на тым жа прадпрыемстве — ці то энергетык, ці то інжынер-механік, ці то тэхнолаг, — замацаваць кадры, — адзначае ён. — Гэта вельмі важна, таму што ў раёнах ёсць пэўны ўзровень прамысловых магутнасцяў, якія трэба загружаць і пры гэтым выкарыстоўваць маладыя кадры для таго, каб вытворчасць паспяхова развівалася.

Указ своечасовы, дапаможа зацікавіць моладзь прыязджаць і заставацца ў невялікіх гарадах. А там сёння чакаюць не толькі прамыслоўцаў, але і педагогаў, медыкаў, іншых спецыялістаў, запатрабаваных на рынку працы.

Вельмі паказальна, што Прэзідэнт з першага ж дня пасля выбараў закрануў такую актуальную тэму. Указ «Аб асаблівасцях прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля» адкрывае новыя магчымасці. Імпануе, што кіраўнік дзяржавы не адкладвае на потым выкананне сваёй перадвыбарнай праграмы. Для маладых спецыялістаў запатрабаваных прафесій, у якіх мае патрэбу раён, гэта яшчэ адзін плюс. Плюс у тым, што па кошце такое жыллё будзе абыходзіцца танней. Паколькі, у адпаведнасці з указам, на такое жыллё прадугледжаны паніжальны каэфіцыент. Не сумняваюся, што такія прэферэнцыі пасадзейнічаюць замацаванню неабходных спецыялістаў у раёнах.

«Указ дае магчымасці манеўру»

Юрый НАРКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў:

— Указ Прэзідэнта «Аб асаблівасцях прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля», падпісаны 27 студзеня, дае органам улады на месцах дадатковыя магчымасці для замацавання кадраў. У кожным раёне свая сітуацыя з кадравым забеспячэннем. Здараецца, што недзе не хапае ўрачоў, у другім месцы — праблема з кадрамі педагагічнага профілю. А названы ўказ дае магчымасці манеўру — аператыўнага выдзялення кватэрыз патрэбнаму спецыялісту. Бо жыллёвае пытанне, як вядома, — ключ для вырашэння названай праблемы.

Асабліва гэта датычыцца сельгаспрадпрыемстваў. Сёння ў сельскай мясцовасці немагчыма замацаваць спецыяліста, калі не выдзеліш яму добраўпарадкаванае жыллё. Некаторыя гаспадаркі ўжо маюць падобны вопыт. Прыклады я назіраю ў тым ліку і ў сваёй акрузе. ААТ «Ружаны-Агра» Пружанскага раёна пабудавала дом з арэндным кватэрамі для сваіх спецыялістаў і работнікаў. Можна разлічваць на тое, што падобная практыка будзе распаўсюджвацца на большасць сельгаспрадпрыемстваў.

Варта сказаць, што названы ўказ прадыктаваны жыццём рэгіёнаў, ён саспяваў у глыбінцы. Мы, дэпутаты, працуючы кожны месяц у сваіх акругах, з кіраўнікамі раёнаў абмяркоўвалі спосабы вырашэння кадравай праблемы, затым агучвалі яе перад сваім кіраўніцтвам. Урад краіны прапрацоўваў пытанне па сваёй лініі. Інфармацыя акумулявалася ў Адміністрацыі Прэзідэнта. Увесь час руку на пульсе праблемы трымаў кіраўнік дзяржавы. Нездарма ж яе вырашэнне было прадугледжана перадвыбарнай праграмай Аляксандра Лукашэнкі, і нездарма ўказ быў падпісаны ў першы дзень пасля перамогі на выбарах.

Нэлі ЗІГУЛЯ, Святлана ЯСКЕВІЧ.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Калинковичское РайПО (продавец) извещает о проведении **7 февраля 2025 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу:

г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161275 площадью 387,7 кв. м. (здание кафе «Калинка», назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: подвал, здание склада), расположенное на земельном участке с кадарстровым номером 322385801101000545 по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул. Мира, 26. В состав лота входит оборудование в количестве 60 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

Начальная цена продажи без НДС – 28 200,00 бел. руб.

Задаток – 282,00 бел. руб.

Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161277 площадью 307,3 кв. м (здание магазина « Продтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: подвал), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322385801101000545 по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул. Мира, 26/1. В состав лота входит оборудование в количестве 5 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

Начальная цена продажи без НДС – 17 100,00 бел. руб.

Задаток – 171,00 бел. руб.

Лот № 3: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161276 площадью 341,7 кв. м (здание магазина «Промтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: склад), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322385801101000545 по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул. Мира, 26/2. В состав лота входит оборудование в количестве 43 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

Начальная цена продажи без НДС – 23 700,00 бел. руб.

Задаток – 237,00 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона.

Продавец: Калинковичское РайПО, г. Калинковичи, ул. Ломоносова, 19. Конт. тел. +375 232 34-98-92.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк Бел-ВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026. 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 06.02.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует о проведении повторного аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Завод газетной бумаги» (Продавец) на праве хозяйственного ведения

Аукцион состоится 14.02.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Лот № 1: дизельный вилочный погрузчик HELI CPCD 15, год ввода в эксплуатацию – 15.05.2008, серийный № 01015D9900KU, инв. № 478. ***Начальная цена продажи: 4 224,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 422,40 бел. руб.***

Лот № 2: погрузчик дизельный Doosan-Daewood D20SC-2, год ввода в эксплуатацию – 15.05.2008, инв. № 469 в комплекте с навесным оборудованием: захват для рулонов KPR 20B-01A (инв. № 471, год ввода в эксплуатацию – 15.05.2008). ***Начальная цена продажи: 6 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 660,00 бел. руб.***

Лот № 3: погрузчик дизельный Doosan-Daewood D20SC-2, г. в. – 2007, инв. № 477 в комплекте с навесным оборудованием: захват для рулонов KPR 20B-01A (инв. № 472, год ввода в эксплуатацию – 15.05.2008). ***Начальная цена продажи: 6 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 660,00 бел. руб.***

Лот № 4: автобус MAZ 152062, тип кузова – вагон, кузов (рама) №Y3M15206290000530, р/з – АВ 0439-6, г.в. – 2009, кол-во пассажирских мест, шт. – 45, инв. № по бух. учету 00000912. ***Начальная цена продажи: 46 140,54 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 4 614,05 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 13.02.2025 до 11.00. Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь https://gki.gov.by/ru/auction, Могилевского облисполкома https://mogilev-region.gov.by и на торговой площадке GOSTORG.BY. Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк строгой отчетности «Обязательное медицинское страхование иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь» серии БВМ № 0047031 в количестве 1 экземпляра **считать недействительным**

УНП 100122726

РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества должника.
Электронные торги состоятся **28.02.2025 в 11.00**

Лот № 1: склад ГСМ с инв. № 600/С-179776. Площадь – 183.0 кв. м. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Лесковка, ул. Совхозная, 9А/2.

Обременение: 1. Запрет на совершение регистрационных действий. 2. Арест.
Идентификационные сведения о правообладателе: открытое акционерное общество «МИНСКВОДСТРОЙ».
Начальная цена продажи – 177 300,00 руб. Задаток – 17 730,00 руб.
Земельный участок 623680600010000039 площадью 2,1006 га. Целевое назначение: для обслуживания производственной базы. Право постоянного пользования. Обременение: запрет на совершение регистрационных действий. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги.
Шаг электронных торгов – 5 %.
1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на электронных торгах Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
3. Переход права собственности на приобретённый на электронных торгах Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе о порядке их проведения, об оформлении участия в них размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.02.2025 в 16.00

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества должника.
Электронные торги состоятся 28.02.2025 в 11.00 .

Лот № 1: Многофункциональное помещение с инв. № 500/D-708158819. Площадь – 168.8 кв.м. Назначение: Помещение многофункциональное. Адрес: г. Минск, ул. Кирова, 8-5.

Обременение: 1. Запрет на совершение регистрационных действий. 2. Арест. 3. Ипотека.
Идентификационные сведения о правообладателе: общество с ограниченной ответственностью «КИРОФФ».
Начальная цена продажи – 1 163 700,00 руб. Задаток – 116 370,00 руб.
Многофункциональное помещение с инв. № 500/D-708158819 находится в капитальном строении с инв. № 500/С-62833, расположенном на земельном участке 500000000003004642 площадью 0,5565 га. Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания здания многофункционального. Право аренды, срок действия: с 16.12.2015 по 31.05.2025.
Шаг электронных торгов – 5 %.
1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на электронных торгах Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
3. Переход права собственности на приобретённый на электронных торгах Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе порядке их проведения, об оформлении участия в них размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.02.2025 в 16.00

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

ЯСКРАВАЕ ДАПАЎНЕННЕ

У дадатковы — шосты — дзень асноўнай пляцоўкай рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» стала Нацыянальная бібліятэка. Побач з галоўнай кніжнай скарбніцай працавалі інтэрактыўныя зоны, праходзіў канцэрт «Мы разам!». Нягледзячы на моцны пранізлівы вецер, тут было горача: на сцэну, якая размясцілася побач з «храмам кнігі», выходзілі таленавітыя маладыя спевакі і блогеры.

СВЯТА ДЛЯ МОЛАДЗІ

Было адчуванне, што на сустрэчу з кумірамі з'ехаліся маладыя фанаты з усяго Мінска. Хлопцы і дзяўчаты спявалі разам з любімымі выканаўцамі, рабілі сэлфі і відэа з канцэрта.

З раніцы быў запушчаны квэст «Гэта ўсё маё роднае», калі каманды ў 5–10 чалавек павінны былі за кароткі час паспець прайсці некалькі станцый з падрыхтаванымі для іх пытаннямі па культуры, гісторыі, літаратуры, расказаць альбо даведацца пра дасягненні нашай краіны, выканаць танцавальныя і песенныя заданні. За дзень квэст прайшлі 179 каманд (каля дзвюх тысяч чалавек). Як расказалі валанцёры — а квэст праводзілі студэнты розных ВНУ сталіцы, — да пазнавальнай гульні далучаліся школьнікі, навучэнцы, працоўная моладзь, сем'і. Самаму юнаму ўдзельніку было каля шасці гадоў, а старэйшаму — за семдзесят. «Цудоўна, што марафон аб'ядноўвае ўсе пакаленні. Нам жа, валанцёрам, вельмі цікава было працаваць з людзьмі. Яны зараджалі пазітывам, казалі, што нас любяць», — падзялілася ўражаннямі **сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры Таццяна КАНАНОВІЧ**.

ФІНАЛЬНЫ ФЛЭШ-МОБ

Удзельнікі яго сабраліся каля Нацыянальнай бібліятэкі, каб выканаць гімн Рэспублікі Беларусь. Разам паспяваць прыехалі прадстаўнікі навучальных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый. Да вялікага хору, які пачаў збірацца на прыступках Нацыянальнай бібліятэкі, далучыліся арганізатары мерапрыемства, валанцёры, блогеры і шматлікія госці.

Сярод удзельнікаў флэш-мобу былі і прадстаўнікі ваенна-патрыятычнага клуба «Арлянаты». Нашчадкі Перамогі» пры сярэдняй школе № 72. Паліна Генчык расказала, што іх аб'яднанне створана, каб шанаваць традыцыі, а галоўная яго мэта — не дапусціць таго, каб гісторыя і подзвіг народа былі забытымі. Дзяўчына заўважыла, што «Марафон адзінства» аб'ядноўвае людзей, даносіць важныя ідэі, расказвае пра гісторыю, падтрымлівае таленты.

Вучні сярэдняй школы № 15 прыехалі на марафон разам з кіраўніком па ваенна-патрыятычным выхаванні Аляксандрам Іваненкам. Школьнікі далучыліся да конкурсаў, пазнаёміліся з выстаўкай рарытэтных плакатаў. Настаўнік заўважыў, што акцыя дае магчымасць моладзі лепш пазнаёміцца са сваёй краінай, даведацца пра яе дасягненні.

Ганна ПЯТРОВА.

3 НАГОДЫ

ЗНАЁМСТВА З КУЛЬТУРНЫМ КОДАМ

адбылося для замежных назіральнікаў

Вечар напярэдадні выбараў стаў па-сапраўднаму святочным для гасцей Палаца Рэспублікі, якія змаглі атрымаць асалоду ад гала-канцэрта майстроў мастацтваў і таленавітай моладзі «Мая зямля, мая Радзіма названа светла — Беларусь». Сярод запрошаных было шмат міжнародных назіральнікаў, якім гэтае шоу дапамагло бліжэй пазнаёміцца з культурай нашай краіны.

Па словах **міністра культуры Руслана ЧАРНЕЦКАГА**, такія мерапрыемствы вельмі стануюча адбіваюцца на іміджы дзяржавы.

— Многія замежнікі ўпершыню ў Беларусі. Гэты велізарны канцэрт у першую чаргу быў зроблены для таго, каб іх парадаваць. Не для таго, каб перад кімсьці пакрасавацца, а для таго, каб паказаць: мы вельмі любім нашых сяброў і гасцей. Менавіта таму мы робім усё для таго, каб ім было тут добра і камфортна, — заключыў ён.

Уразіў гледачоў нумар «А можа, не было вайны», падчас якога Руслан Чарнецкі выйшаў з мікрафонам з глядзельнай залы і далучыўся да іншых артыстаў на сцэне.

— Гэта была ідэя рэжысёра Ганны Маторнай, якая ставіла канцэрт. У прынцыпе гэта правільна і лагічна, бо я і міністр культуры, і артыст. Я павінен сумяшчаць гэтыя два сусветы, — падзяліўся ён.

Канцэрт атрымаўся грандыёзным і прадуманым да дробязяў. Не абышлося і без інтэрактываў. Так, падчас аднаго з нумароў дзяўчаты з хлебам і соллю адправіліся ў глядзельную залу частаваць гасцей. Пасля такога абыякавых не засталося дакладна.

Назіральнік з Арабскай Рэспублікі Егіпет Махамед ТАРЭК расказаў, што ніколі ў сваім жыцці яшчэ не бачыў такога цудоўнага шоу.

— На самай справе ў мяне не хапае слоў, каб перадаць свае станоўчыя эмоцыі. Сёння я размаўляў са сваімі калегамі, у прыватнасці, аб прыгажосці вашых традыцый і звычаяў. Па праўдзе сказаць, Мінск мне спадабаўся больш за іншыя еўрапейскія гарады. Ён чысты і прыгожы. Я люблю вашу сталіцу! — падзяліўся ён.

У сваю чаргу **назіральнік з Рэспублікі Кенія Ледама АЛЕКІНА** адзначыў важнасць таго, каб у ноч перад выбарамі людзям нагадвалі, што самае галоўнае — іх краіна.

— Гэтае мерапрыемства прадэманстравала яднанне, а таксама гнуткасць і мэтанакіраванасць беларускага кіраўніцтва ў аб'яднанні людзей, — заключыў ён.

Цікава было паслухаць і меркаванне **назіральніка ад Сардружнасці Незалежных Дзяржаў Руслана СМАШНЁВА** са Смаленскай вобласці, які таксама з'яўляецца членам Парламенцкага саюза Беларусі і Расіі.

— Мы — прыгранічны рэгіён, таму агульная гісторыя дае аб сабе ведаць. З аднаго боку, ты знаходзішся ў іншай дзяржаве, а з другога — адчуваеш сябе як дома. Таму многія канцэртныя нумары знаходзілі ў нас жывы водгук, — падзяліўся ён. — Год таму ў нашай краіне таксама праходзілі выбары Прэзідэнта. І вось адчуванні шмат у чым падобныя. Іншымі словамі, акрамя таго, што выбары — гэта сапраўды вельмі сур'ёзнае дзяржаўнае мерапрыемства, не варта забываць, што гэта і свята ў тым ліку.

Прыемным падарункам для гасцей Палаца Рэспублікі акрамя канцэртнай праграмы стаў і выставачны праект аб выбарах у нашай краіне, які падрыхтаваў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі сумесна з Цэнтрвыбаркамам. Паводле слоў дырэктара музея Аляксандра Храмога, у экспазіцыі сабрана больш як 300 экспанатаў, якія ў храналагічным парадку ад Сярэдневечча да сённяшняга дня паказваюць, як праходзілі выбары на тэрыторыі Беларусі.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Ганна ЛУКАШЭНКА:

«НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА»

«З сумам і адначасова з радасцю падводзім вынікі, бо мы рэалізавалі ўсё, што было запланавана, і нават больш», — падзялілася ўражаннямі кіраўнік рабочай групы па арганізацыі «Марафону адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА.

У рамках марафону прайшлі сотні акцый і мерапрыемстваў у розных рэгіёнах краіны, толькі ў Мінску іх было каля сямідзесяці.

Ганна Лукашэнка расказала, што з самага пачатку задумвалася маштабная рэспубліканская акцыя, але арганізатары не маглі ўявіць, наколькі ўжо ў працэсе яна будзе пашыравацца, напаўняцца новымі мерапрыемствамі: «Марафон цікавы тым, што атрымаўся жывым арганізмам, ён пастаянна прырастаў ідэямі». Так, ідэя акцыі «Адну справу робім» належыць калектыву Беларускага металургічнага завода. Пасля супрацоўніца Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання напісала песню, якая стала дэвізам для акцыі. Праект «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт», у рамках якога былыя дзяржслужачыя дзеляцца сваім вопытам, прыдуманы дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Вадзімам Гігіным. Спецыяльна для марафону былі распрацаваныя новыя мерапрыемствы, выстаўкі. Многія з іх маглі б развівацца ў далейшым як самастойныя праекты. Удзельнікі набылі ўнікальны вопыт. Такім чынам, супрацоўнікі Вялікага тэатра выйшлі за сцены сваёй установы: вывозілі касцюмы, рэквізіт, у розных гарадах расказвалі пра творчасць. Ужо паступіў запыт на тое, каб некаторыя выстаўкі, створаныя для марафону, былі працягнуты.

Калі спачатку здавалася, што ўсюды марафон пройдзе па стандартнай праграме, то ўжо пасля акцыі ў першым гарадзе канцэпцыя была зменена, пад кожны населены пункт ствараўся індывідуальны план, каб паказаць яго ўнікальнасць. Многія акцыі дабаўляліся, як кажуць, «з калёс». Так, калі каманда арганізатараў марафону прыбыла ў Наваполацк, там паведамілі, што на гарадской плошчы пройдзе выстаўка тэхнікі, і ў праграму дадалася новая акцыя — «Гэта мая краіна».

Падчас марафону праходзілі сустрэчы і канцэрты на прадпрыемствах, наведваліся знакавыя мясціны, адбываліся знаёмствы з цікавымі людзьмі. А галоўнае, што гэта інфармацыя транслявалася на ўсю краіну. «Такім чынам, мы рабілі вялікую агульную справу па яднанні людзей. А яшчэ гэта задзел на будучыню. Марафон паказаў, што самы час нам, беларусам, пачаць любіць сваё. Нам ёсць чым ганарыцца: людзьмі, прадукцыяй, нашай краінай», — заўважыла Ганна Лукашэнка.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Государственным предприятием «БелЮрОбеспечение» (192821149) назначено проведение электронных торгов

Организатор	Филиал № 5 «Гродненский КСМ» ОАО «Красносельскстройматериалы»
Предмет	Лот № 9.2025.02.00016 клуб-столовая площадью 2328,1 м кв.
Местонахождение	г. Гродно, ул. Санаторная, 5Б
Начальная стоимость	521 171,00 бел. руб. с НДС

Торги будут проведены 13.02.2025 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by
Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16:00 12.02.2025.
Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы»

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00028** о продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

Продавец: Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по городу Жодино, 222160, Минская обл., г. Жодино, пер. Автозаводской, 5, тел. 801775 4 97 12.
Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by
Дата и время проведения торгов: 27.02.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Автомобиль SAMAND TU5, 2012 г. в., тип – легковой автомобиль седан (sedan), кузов (рама) №Y3W2PSMTUCUNS1318, цвет – светло-серый, инв. №01510003. Выданы регистрационные знаки для транспортных средств временно допущенных к участию в дорожном движении 5HET3358.

Местонахождение имущества: Минская обл., г. Жодино, пер. Автозаводской, 5.
Нач. цена: 3433,11 бел. руб. без НДС. **Задаток:** 343,31 бел. руб.
Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 26.02.2025.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375297707844, Лисицина Любовь Петровна

РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества должника.
Электронные торги состоятся **28.02.2025 в 11.00**

Лот № 1: механическая мастерская с котельной
с инв. № 600/С-97057. Площадь – 596,8 кв. м.
Назначение: здание нежилое. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, 68/1, район д. Лесковка.

Обременение: 1. Ипотека. 2. Запрет на совершение регистрационных действий. 3. Арест. 4. Аренда.
Идентификационные сведения о правообладателе: открытое акционерное общество «МИНСКВОДСТРОЙ».
Начальная цена продажи – 777 600,00 руб. Задаток – 77 760,00 руб.
Земельный участок 623680600010000039 площадью 2,1006 га. Целевое назначение: для обслуживания производственной базы. Право постоянного пользования. Обременение: запрет на совершение регистрационных действий. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги
Шаг электронных торгов – 5 %.
1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на электронных торгах Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен по согласованию с уполномоченным органом, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
3. Переход права собственности на приобретённый на электронных торгах Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
Организация и проведение электронных торгов осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе порядке их проведения, об оформлении участия в них размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.02.2025 в 16.00

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

ЧАС «ЭЛІТЫ»

Новыя сарты сельскагаспадарчых культур: якія якасці ў прыярытэце?

За чатыры дзесяцігоддзі селекцыянерамі НПЦ па земляробстве НАН Беларусі створана амаль шэсць соцень сартоў збожжавых, зернебабовых, кармавых, тэхнічных і крупяных культур. Некаторыя з іх дзесяцігоддзямі застаюцца эталоннымі ў нашай краіне і СНД. Але XXI стагоддзе змяняе не толькі тэхналогіі, але і падыходы ў селекцыі. Ад новых сартоў і гібрыдаў патрабуецца адаптаванасць пад рэгіянальныя кліматычныя ўмовы, высокая ўраджайнасць без нарошчвання аграхімій, неўспрымальнасць да хвароб і шкоднікаў. Якім павінен быць сорт, каб быць канкурэнтным, расказаў доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Эрома УРБАН.

НАЙВАЖНЕЙШЫЯ КРЫТЭРЫІ

Асноўны прыярытэтны кірунак селекцыі — гэта ў першую чаргу ўстойлівая высокая патэнцыяльная ўраджайнасць, падкрэсліў суразмоўца:

— Усе зарэгістраваныя сарты НПЦ па земляробстве маюць высокі ўзровень ураджайнасці (больш за 100 ц/га ў збожжавых, да 60 ц/га — у зернебабовых і г. д.) і цалкам канкурэнтныя на фоне дасягненняў замежнай селекцыі.

Яшчэ адзін найважнейшы крытэрый, калі казаць пра збожжавыя, — «палепшаныя якасці атрыманай прадукцыі ў хлебапячэнні», іншымі словамі, перш за ўсё смак.

— Практычна ўсе новыя раяніраваныя сарты яравой пшаніцы з'яўляюцца каштоўнымі па якасці ў хлебапячэнні, — тлумачыць доктар сельскагаспадарчых навук. — З найлепшых за апошнія гады магу назваць сарты яравой пшаніцы «Вестачка 17», «Красавица», «Знамя». Што датычыцца азімай пшаніцы, у 2024 годзе сорт «Асіма» прызнаны найлепшай распрацоўкай Нацыянальнай акадэміі навук. «Асіма» добра зімуе, адаптыўны да фактараў асяроддзя (ад замаразкаў да засух), мае высокую патэнцыяльную ўраджайнасць (звыш 120 ц/га), устойлівасць да палягання і асноўных відаў хвароб.

Але важна разумець: абсалютна ўстойлівы да любых хвароб сорт раслін стварыць пакуль не ўдалося нідзе ў свеце, кажа навуковец.

— Шкодныя арганізмы муцыруюць: адаптуюцца да пестыцыдаў, новых відаў і культур, зменлівага клімату. І пацяпленне — на іх баку. Раней, пры стабільным «мінусе» зімой, большая частка аднагадовага пустазелля гінула ў перыяд пераразімоўкі, і тое ж датычылася глебанасельных шкоднікаў. Цяпер яны добра зімуюць. З'яўляюцца таксама новыя віды пустазелля і шкоднікаў, нетыповыя для нашых шырот.

РЫЖЫК, СОЯ І «ЗІМАВАЛЬНЫ» ГАРОХ

Крытэрыяў, на якія сёння трэба звяртаць увагу пры селекцыі стратэгічных відаў сельгасраслін, мноства.

— Але любы жывы арганізм — гэта баланс. І, паляпшаючы адно, мы нязменна губляем у іншым. Гэта да пытання аб тым, чаму варта рабіць стаўку на сарты айчыннай селекцыі. Яны створаны ў нашых умовах і адаптаваны да іх.

Многія замежныя сарты высокапрадукцыйныя, але не пластычныя. Пры спрыяльных умовах яны рэалізоўваюць свой патэнцыял прадукцыйнасці. Аднак ідэальных умоў у Беларусі практычна не бывае. Калі нешта пойдзе не так, такі сорт больш за іншыя знізіць ураджайнасць.

Лепш атрымліваць штогод стабільныя (і досыць высокія) ураджаі, чым раз на 5—10 гадоў — рэкордныя, а ў астатнія гады — нізкайшыя за сярэднія.

Якія культуры сёння цікавыя селекцыянерам?

— Вялікая ўвага — кармавым культурам: у нашай краіне развіта жывёлагадоўля. Гэта экспарт, вялікая ўдзельная вага ў бюджэце краіны, а значыць, сфера павінна быць забяспечана кармамі. Перспектыўны кірунак — азімыя формы збожжавых і зернебабовых. Цікавы праект — зімавальныя формы гароху, па стварэнні якіх цяпер вядзецца работа. У краінах СНД такога пакуль няма. Любая зернебабовая культура патрабавальная да ўвільгатнення глебы, і гэта ў апошнія гады крытычны момант, улічваючы засухі, што паўтараюцца з году ў год. Калі атрымаем устойлівa зімавальную форму гароху, ён будзе выкарыстоўваць зімовыя запасы вільгаці, не пацерпіць ад засух і раней будзе даваць ураджай.

У даччыным прадпрыемстве «Палескі інстытут раслінаводства» створаны гібрыды кукурузы, сланечніку, сарты сорга і шматгадовых траў, распавёў Эрома Урбан:

— У Дзяржаўны рэестр Беларусі з 2024 года ўключаны трохлінейны ранняспелы гібрыд кукурузы ВІВАЛЕН 3620, а з 2025-га — гібрыд кукурузы ВІВАЛЕН 3821. Лінейка «Вівален» — гібрыды новай фармацыі з высокімі паказчыкамі адаптыўнасці і прадукцыйнасці, створаныя з выкарыстаннем абсалютна новага выходнага матэрыялу. Патэнцыяльная ўраджайнасць збожжа — 140—150 ц/га, патэнцыяльная ўраджайнасць сухога рэчыва пры ўборцы на сілас — 230—250 ц/га. Створаны высокапластычны сорт інтэнсіўнага тыпу — сорга збожжавае «Крынічнае», якое можа выкарыстоўвацца для стабілізацыі ўраджайнасці збожжа ва ўмовах недахопу вільгаці.

Селекцыянерамі пачаты таксама распрацоўкі па соі. Гэта высокабялковая культура, адзначае навуковец. Бялок соі на 98 % ідэнтычны бялку жаночага малака. І бялку ў насенні соі ўдвая больш, чым у такім жа аб'ёме свініны.

— З мінулага года займаемся вывучэннем такой нетрадыцыйнай для Беларусі тэхнічнай культуры, як рыжык. Культура гэта далёкаўсходняя, і пакуль яна для нас — пілотны праект.

ВЫРОШЧВАЕМ СВАЁ

У мінулым годзе ў Дзяржрэестр Рэспублікі Беларусь уключана 20 сартоў, перададзена ў Дзяржсортавыпрабаванне 35 сартоў сельскагаспадарчых раслін, а за апошнія тры гады рэестр папоўніўся 47 новымі сартамі селекцыі НПЦ НАН Беларусі па земляробстве.

— Пастаўлена задача: да 2030 года дасягнуць выкарыстання ў пасевах сельскагаспадарчых раслін не менш за 80 % сартоў беларускай селекцыі, — канстатаваў вучоны.

На сёння гэты паказчык складае ў сярэднім крыху больш за 70 %, канкрэтызаваў ён.

— Летась на палях краіны апрацоўвалася 140 сартоў сельскагаспадарчых раслін селекцыі НПЦ па земляробстве, — распавёў Эрома Урбан. — Так, беларускія сарты азімага трыцікале займаюць 83 % пасяўных плошчаў краіны, жыта — 88 %, яравой пшаніцы — 84 %, ячменю — 81 %, аўса — 98 %, грэчкі — 75 %. Дарэчы, у Расійскай Федэрацыі сарты нашага цэнтра (46 найменняў) займаюць плошчу больш за 2 млн га.

Штогадовая вытворчасць арыгінальнага і элітнага насення ў цэнтры — больш за 100 сартоў.

Сёння ў аграрнай сферы навукоўцам важна мысліць гнутка і пралічваць крокі на гады наперад: толькі за апошняе дзесяцігоддзе структура сельскагаспадарчых раслін на палях краіны істотна змянілася.

— Значна павялічылася доля пасяўных плошчаў кукурузы, — тлумачыць суразмоўца. — Пашырыліся плошчы пад кукурузу на зерне (у мінулым годзе яны склалі больш за 280 тыс. га), зменшыліся — пад яравую пшаніцу і авёс. Застаюцца даволі значнымі плошчы пад яравы ячмень (парадку 240 тыс. га). Актыўна робіцца стаўка на азімыя: на іх вышэйшы патэнцыял прадукцыйнасці. У прыярытэце і тэхнічныя культуры — рапс, цукровыя буракі. Скарачаецца колькасць пасяўных плошчаў пад бульбу: летась — толькі 17 тыс. га. Гэтага дастаткова для патрэб краіны пры ўмове стабільна высокай ураджайнасці, — адзначае доктар навук. — Думаю, такая структура досыць рацыянальная і не будзе патрабаваць істотных змен і ў гэту пасяўную кампанію.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)* по поручению УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт» *(Продавец)* проводит открытый аукцион по продаже

изолированного помещения с инв. № 612/D-21137
(наименование – торговое помещение № 1) общей площадью 197,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, пр-т Ленина, 17, корп. 3.

Помещение находится на цокольном этаже 2-этажного здания торгового комплекса.

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 641300000001000583 площадью 0,0967 га, право аренды.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 642 346,30** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 64 234,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **28.02.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.02.2025** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (044) 538-61-27.**

УНП 600033917

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **18 февраля 2025 года** в рамках **388-го открытого аукциона** по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество) проводит аукцион по продаже права заключения договора аренды

№ предмета аукциона	Арендодатель имущества	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м)	Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ	Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.)	Наименование и целевое использование имущества
51	РНПЦ МТ, тел. 8017 311 50 52	**г. Минск, ул. П. Бровки, 7Б**	84,4	126,6 БАВ (за всю площадь)	374,74	Отдельно стоящее здание под автомойку. **Срок аренды 3 года**

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22. Аукцион состоится **18 февраля 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 24 января 2025 г. по 12 февраля 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 388 от 18.02.2025 по предмету аукциона № 51**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета • www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь • www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). Телефон для справок +375 (17) 360 42 22

ПАДЗЕЯ

«ПОСПЕХ КАЛАСАЛЬНЫ!»

Выстаўку «Мая Беларусь» наведала больш за 400 тысяч чалавек

Выстаўка дасягненняў «Мая Беларусь», якой адкрыўся 28 снежня Мінскі міжнародны выставачны цэнтр (сучасная экспазіцыйная пляцоўка, якая не мае аналагаў у нашай краіне па інавацыйнасці), задумвалася як унікальная падзея, што натхняе адкрываць для сябе нашу краіну — упершыню або нанова. І задуманае ўдалося. Пра гэта сведчаць і водгукі наведвальнікаў, і колькасць гасцей экспазіцыі — больш за 400 тысяч. Людзі былі рады больш даведацца пра сваю краіну, захапляцца ёю, падкрэсліў, падводзячы вынікі выстаўкі «Мая Беларусь», **дырэктар Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа» Сяргей БАРАН**.

УСІМ СЭРЦАМ З КРАІНАЙ

Выстаўка завяршыла работу 27 студзеня, і відавочна, што гэты культурны праект застанецца ў гісторыі краіны дзякуючы той унікальнай атмасферы, якую ўдалося стварыць яе арганізатарам. Прывітальны адрас **кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Юрыя НАЗАРАВА** са сцэны фінальнага канцэрта выстаўкі «Мая Беларусь» абвясціў **першы намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалай ШКРЭД.** Беларусы ўмеюць працаваць, ствараць, здзяйсняць навуковыя адкрыцці, спасцігаць космас, расціць хлеб, вырабляць найшырэйшы спектр прадукцыі, вырашаць самыя складаныя задачы, дасягаць пастаўленых мэт, адзначаецца ў прывітальным адрасе.

— Разам мы робім усё магчымае, каб Беларусь была паспяховай высокаразвітой краінай, — прагучала са сцэны ММВЦ. — Сведчаннем таму стала гэтая маштабная выстаўка дасягненняў суверэннай Беларусі. Яе мэтай было паказаць і расказаць, у першую чаргу маладому пакаленню, чаго дасягнула наша краіна за гады незалежнасці.

Выстаўка прайшла з вялікім поспехам, канстатаваў у прывітальным адрасе Юрый Назараў: «Цікавасць, праяўленая з боку грамадзян Рэспублікі Беларусь і замежных гасцей, перасягнула чаканні. Поспех каласальны. За месяц яе наведала больш чым 400 тысяч чалавек з розных куткоў Беларусі і не толькі. У тым ліку — 120 тысяч дзяцей. У рамках выстаўкі адбылося каля 70 культурна-забаўляльных падзей, 25 дзелавых мерапрыемстваў. На канцэртнай пляцоўцы выступілі 74 творчыя калектывы, у тым ліку Прэзідэнцкі аркестр, канцэрт якога сабраў амаль тысячу чалавек. Свае пажаданні і водгукі на лакацыі «Усім сэрцам з Беларуссю» пакінула больш за 10 тысяч наведвальнікаў. «Мая Беларусь» наглядна прадэманстравала: калі мы разам, мы можам зрабіць усё».

СПРАВА ГОНАРУ

— Для нас гэта велізарны поспех, — падкрэсліў дырэктар «БелЭкспа». — Мы ганарымся тым, што ўдалося паказаць беларусам, чаго дасягнулі за гады незалежнасці: на простай, зразумелай мове расказаць пра іх саміх.

Нагадаем, што выстаўка «Мая Беларусь» займала плошчу больш чым 30 тысяч квадратных метраў, экспазіцыя складалася з 11 лакацый («Знак якасці», «Культурная спадчына», «Разумны горад», «Прыгожая краіна», «Навука і інтэлект», «Клопат пра здароўе», «Спартыўная краіна», «Атамная энергія», «Сельская гаспадарка» і г. д.) і ўключала велізарную колькасць унікальных экспанатаў, многія з іх упершыню дэманстраваліся шырокай грамадскасці. У прыватнасці, у кожнага была магчымасць не толькі ўбачыць, але і дакрануцца да капсулы, у якой вярнулася на зямлю першы касманаўт суверэннай Беларусі Марына Васілеўская («касмічная» лакацыя была адной з самых папулярных). А таксама ацаніць першы беларускі электрамабіль BelGee EX50. Акцэнт арганізатары зрабілі і на інтэрактыўнасць: мноства сімулятараў, якія даюць рэальныя адчуванні (напрыклад, кіравання сучасным трактарам), а таксама розныя «віртуальныя экскурсіі» спадабаліся і дзецям, і дарослым.

Падчас цырымоніі закрыцця выстаўкі на сцэне ММВЦ адбылося ўзнагароджанне за эфектыўнае супрацоўніцтва ў арганізацыі і правядзенні гэтага грамадска значнага мерапрыемства. Падзякі Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удастоіліся Міністэрства прамысловасці, канцэрны «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам», «Белнафтахім», міністэрствы спорту і турызму, сельскай гаспадаркі і харчавання, па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі і Дзяржаўны пагранічны камітэт Рэспублікі Беларусь, абласныя выканаўчыя камітэты, іншыя міністэрствы, ведамствы і арганізацыі краіны. І, вядома, Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа». Дырэктар «БелЭкспа» паабяцаў падтрымліваць добрую традыцыю — мерапрыемствы ў новым выставачным цэнтры і ў далейшым будуць такімі ж яркімі і маштабнымі.

— Наступнае будзе прысвечана 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, — праанансаваў ён. — Выстаўка пакажа і распавядзе беларусам пра тое, як гераічна абаранялі краіну. Думаю, яна яшчэ больш ярка раскрые патэнцыял нашага новага выставачнага цэнтра.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00029** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

Продавец: ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by.**

Дата и время проведения торгов: 28.02.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. №200/D-163202, площадью 217,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11Г-10, назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – нежилое помещение подвала. Примечания: нежилое помещение подвала. Крыльца бетонные – 17 кв. м. Места общего пользования – тамбуры – 6,5 кв. м, лестничные клетки – 19,2 кв. м, 17,8 кв. м, 23,0 кв. м, 17,3 кв. м, 19,7 кв. м, 17,1 кв. м, 19,7 кв. м, 16,9 кв. м, 19,4 кв. м, коридоры – 22,5 кв. м, 16,8 кв. м, машинное отделение – 116,8 кв. м, мастерская лифтеров – 15,3 кв. м Объем мест общего пользования – 1179 куб. м.

Обременение: договор аренды сроком по 31.03.2026. Запрещение регистрационных действий.

Лифт грузовой ПГ-288 инв № Э 2988 грузоподъемностью 1000 кг.

Нач. цена: 75 982,73 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 7598,27 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.02.2025. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; заключить договор купли-продажи в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить за предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 676,51 бел. руб. с НДС.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375445928209, Светлана Георгиевна

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191 021 390
Продавец	ООО «Эковаларана», г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65Б, УНП 193535318
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронного аукциона

Здание конюшни, 323.3 кв. м, 601/С-34237. Адрес: **Минская обл., Логойский р-н, Янушковичский с/с, 22, вблизи д. Бобры.**

Сведения о земельном участке: пл. **0,7225 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 12.06.2073) для строительства и обслуживания здания конюшни. Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек и водоемов, зона проживания с периодическим радиационным контролем, мелиорируемая земля

Начальная цена лота без НДС – 488 000,00 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) календарных дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: в течение **10 (десяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в г. «Звязда» от 20.12.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.02.2025 с 12.00 до 13.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 11.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by

ДЗЕ НАРАДЖАЮЦЦА НОВЫЯ СЭНСЫ

За гады свайго існавання Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт даў краіне каля 200 тысяч выпускнікоў

Наведваючы ўніверсітэт, кіраўнік дзяржавы сказаў словы, якія поўна і выразна характарызуюць славутую ўстанову адукацыі: «БДУ не проста ўніверсітэт. Гэта гісторыя, будучыня краіны. Народжаны ў гады станаўлення беларускай дзяржавы, ён стаў увасабленнем навуковай і вытворчай сілы сучаснай Беларусі». Унікальнасць гэтай ВНУ прызнана ва ўсім свеце, тут класіка і фундаменталізм гарманічна ўпісваюцца ў сучаснасць — універсітэт тонка рэагуе на час, яго выклікі і патрабаванні. Аб новай хвалі студэнтаў, іх запыце на ісціну і каштоўнасныя ідэалы моладзі, аб місіі ўніверсітэта XXI стагоддзя — наша размова з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктарам педагагічных навук, прафесарам Андрэем КАРАЛЁМ.

— Андрэй Дзмітрыевіч, вы неаднойчы казалі пра тое, што студэнцкія гады — гэта найлепшы час для моладзі: можна марыць, адважвацца і ўвасабляць свае мары ў жыццё. Так было заўсёды. І ўсё ж некалькі дзесяцігоддзяў таму і ВНУ, і студэнты былі іншыя. Сёння вы — кіраўнік вядучага ўніверсітэта краіны і можаце сказаць, чаго ў тыя гады не хапала ва ўніверсітэце, а што ў цяперашніх студэнтаў ёсць?

— Чаму так адбываецца, што студэнцкія гады запамінаюцца як найлепшы час у жыцці? Найперш гэта псіхафізіялогія: перад маладым чалавекам адкрываюцца новыя магчымасці і віды дзейнасці. У перыядызацыі з пазіцыі ўзроставай псіхалогіі студэнцтва — гэта нешта прамежкавае паміж юнацтвам і даросласцю, імгненне паміж мінулым і будучыняй. Гэта той рубікон, пераступіўшы які ідзе фарміраванне і развіццё асобы праз новыя знаёмствы, эмоцыі, камунікацыі і веды. Па сутнасці, жыццёвая філасофія ў маладога пакалення розных дзесяцігоддзяў аднолькавая: тыя ж драйв і жаданне перавярнуць горы. Адзінае, у наш час само жыццё ўжо мае зусім іншыя паказчыкі і хуткасці.

— Гэта і ёсць асноўныя змены?

— Сёння знік дэфіцыт у носьбітах ведаў. Але з'явілася праблема ў падмене паняцця «веданне» звычайным валоданнем інфармацыяй, якая дзівіць даступнасцю і вялікай колькасцю. Веды маюць агранку «веды», калі ідуць знутры; гэта тое, што створана самім чалавекам. А ўсё, што навокал, — проста інфармацыя, яна нічыйная, а таму з'яўляецца ўсеагульнай. Інфармацыю можна перадаць, скапіраваць, захаваць, размножыць, веды — не перадаюцца. Рост інфармацыі і яе крыніц атрымання прывёў да хуткасцяў і павелічэння дыстанцыі паміж людзьмі, выдумкай і рэальнасцю; да расслаення самога чалавека на ўнутранага і вонкавага.

Палярызацыя сёння як адсутнасць поля для дыялогу назіраецца практычна ўсюды і ва ўсім, і нават унутры чалавека, адлюстроўваючы яго трывожнасць. Калі казаць пра моладзь, ды і не толькі пра яе, людзі ўсё часцей і даўжэй «завісаюць» у смартфоне. Для іх гаджэт — гэта сродак атрымання інфармацыі, знаёмстваў і зносін, пакупак і шмат чаго іншага. А на самай справе за новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі шмат рызык для псіхікі чалавека і яго станаўлення як асобы. Людзі карыстаюцца агульнадаступным кантэнтам, пад іх віртуальныя запыты віртуозна фарміруецца кантэнт, які ў выніку прыводзіць да росту агрэсіі. І гэта даказаныя навукай факты.

— І нават у такіх няпростых умовах жыцця моладзь усё яшчэ здольная адважвацца?

— А яна і адважваецца. Сярод нашых выпускнікоў не менш яркіх, паспяховых людзей, чым было дваццаць, трыццаць гадоў таму. Моладзь не стала горшай, яна шмат у чым пераўзыходзіць сваіх папярэднікаў. Сёння важна ўзгадоўваць матывацыю ў маладых людзей, развіваць іх імкненне да пошуку свайго прызначэння і ўнікальнасці. У нашы дні даступна ўсё ці амаль усё. Гэта таксама своеасаблівы выклік для чалавека — калі ён атрымлівае тое, што хоча, ён не творыць, а перанасычаецца. Я не прыхільнік старых метадаў, але элітарная адукацыя не можа быць лёгкай. Яна звязана з самапазнаннем, самамяненнем, адкрыццём сябе і сваёй місіі. Павінен прызнацца, што, калі параўноўваць першакурснікаў тры гады таму і цяпер, яны значна адрозніваюцца. Сёння вельмі матываваныя дзеці, відавочна — да нас прыйшла іншая хваля. Яны рэальна хочуць ведаць і для гэтага ўзмоцнена вучацца.

— Якім вы бачыце ідэальны сучасны ўніверсітэт?

— Місію ўніверсітэта XXI стагоддзя бачу ў тым, каб не проста даць веды. Гэта тэарэтычна зрабіць немагчыма, паколькі веды вырошчваюцца кожным знутры. А вось стварыць умовы, каб студэнт рэалізаваў сябе праз праектную, творчую і іншую дзейнасць, і можна, і трэба. Тады ён зможа выйсці за свае межы, пры падтрымцы выкладчыка ўбачыць свае магчымасці, пад свае жыццёвыя і прафесійныя ўстаноўкі зменіцца і выбудуе сваю траекторыю развіцця — вось тое, што я бачу ў аснове місіі кожнага сучаснага ўніверсітэта. Тут павінен быць дух нараджэння новых сэнсаў і праявы новых ведаў, навуковыя даследаванні і, вядома ж, цікавасць да адукацыі. Гэта месца для самарэалізацыі, прычым у розных сферах жыцця. Сучасны ўніверсітэт — гэта тое поле, праз якое чалавек праходзіць і становіцца іншым, ужо падрыхтаваным да таго жыцця, якое хутка змяняецца, і з разуменнем: хто я ёсць у гэтым свеце. Гэта, мабыць, і ёсць галоўны прынцып універсітэта — нараджэнне новых сэнсаў.

— Адна са значных «фішак» Белдзяржуніверсітэта — навуковая дзейнасць, у якую актыўна далучаюцца студэнты.

На хімфаку БДУ займаюцца ў тым ліку і навуковай дзейнасцю.

— Так і ёсць — навуковая дзейнасць у БДУ будуецца так, каб кожны студэнт мог адчуць сябе часткай вялікіх навуковых праектаў. У БДУ дзейнічае 57 навуковых школ, якія эфектыўна працуюць па зацверджаных у краіне прыярытэтных кірунках навукоўай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Гэта лічбавыя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, аэракасмічныя і геаінфармацыйныя тэхналогіі; біялагічныя, фармацэўтычныя і хімічныя тэхналогіі і вытворчасці; экалогія і рацыянальнае прыродакарыстанне; лазерныя, аптычныя тэхналогіі, мікра-, опта- і ЗВЧ-электроніка, фатоніка і іншыя.

Нашы студэнты бралі ўдзел у навуковым даследаванні з выкарыстаннем даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі для мэт кадастравай ацэнкі сельскагаспадарчых зямель Рэспублікі Беларусь. Не засталіся яны ў баку і ад распрацоўкі і стварэнні двух універсітэцкіх нанаспадарожнікаў, адзін з якіх у цяперашні час паспяхова эксплуатуецца на арбіце і выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе. Універсітэт ганарыцца сваімі распрацоўкамі з удзелам студэнтаў у галіне экалагічна бяспечных біяпрэпаратаў, якія ўжо прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы і ветэрынарыі для лячэння буйной і дробнай рагатай жывёлы, свіней, іншых сельскагаспадарчых жывёл. Тэхналогію атрымання першага айчыннага актыванага вугалю таксама распрацавалі студэнты і навукоўцы БДУ. Дарэчы, за гэтую распрацоўку нашы студэнты ў Расіі ў лістападзе 2024-га ў конкурсе навуковых праектаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі работ узялі трэцюю прэмію.

Алена ВІНАГРАДАВА.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Память-В»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1797	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59890 (назначение — здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование — здание цеха по изготовлению памятников, общая площадь — 464.4 кв. м, составные части и принадлежности — одноэтажное блочное облицованное кирпичом здание цеха по изготовлению памятников с сараем, навесом, складом) Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59735 (назначение — здание административно-хозяйственное, наименование — здание конторы, общая площадь — 50.3 кв. м, составные части и принадлежности — одноэтажное деревянное облицованное кирпичом здание конторы с холодной пристройкой, сараем) Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-59888 (назначение — здание административно-хозяйственное, наименование — здание бытовки, общая площадь — 16.1 кв. м, составные части и принадлежности — одноэтажное блочное здание бытовки с навесом, уборной) Имущество согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/pamjat-v/01-proizvodstvennaja-baza/list-1.pdf	110733,12	11073,31	5536,66

В отношении лота проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 6 (30394) от 11.01.2025, стр. 10

Местонахождение: 222410, Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 3

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000034 площадью 1,7933 га, назначение — для обслуживания зданий и сооружений, на праве постоянного пользования

Дата и время проведения торгов	**7 февраля 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 28 января 2025 года до 15.00 6 февраля 2025 года

Условия для участия в торгах: 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Память-В», проводимых 07.02.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Чеслав, +375299999112.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

Информация о продавце	ОАО «Память-В», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293489225. (222410, Минская область, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 3)
Организатор аукциона	ООО «Фрондера», 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: • 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg

НЕПАЗБЕЖНАСЦЬ ПАКАРАННЯ

Ад адказнасці можа пазбавіць толькі своечасовае прызнанне аб здзейсненым нарказлачынстве

Беларусь — адна з нямногіх краін, дзе змяншаецца колькасць нарказлачынстваў. За гэтым стаіць сур'ёзная работа прафесіяналаў, якія працуюць на апярэджанне. Аднак самазаспакойвацца не варта: у той час як статыстыка ідзе на спад, павялічваецца колькасць непаўналетніх, уцягнутых у супрацьпраўную дзейнасць. Жадаючы лёгкіх грошай, дзеці пагаджаюцца на рызыкоўныя прапановы, пасля чаго атрымліваюць рэальныя тэрміны зняволення. Пры гэтым амаль усе з іх ведаюць: адказнасць за нарказлачынствы наступае з 14-гадовага ўзросту.

Як паўплывае на сітуацыю з наркотыкамі змякчэнне крымінальнага заканадаўства і на што ідуць супрацоўнікі органаў унутраных спраў, каб аператыўна выяўляць злачынцаў, расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ.**

— Алег Канстанцінавіч, зніжэнне колькасці наркатычных злачынстваў — істотны ўнёсак праваахоўных органаў. Як удалося дасягнуць такога выніку?

— Зніжэнне ідзе толькі ў дзвюх краінах СНД — Азербайджане і Беларусі. Асноўныя намаганні — на прафілактыку. Нядрэнны станоўчы вынік маем дзякуючы сумесным намаганням усіх суб'ектаў прафілактыкі. Павялічваецца колькасць раскрытых злачынстваў. Летась удалося канфіскаваць удвая больш наркотыкаў, якія ў асноўным ішлі транзітам праз Беларусь і прызначаліся для іншых краін СНД. Нашы падраздзяленні спрацавалі з плюсам: выяўлена больш каналаў, памяшканняў для вырошчвання і вырабу наркотыкаў, больш, чым заўсёды, ліквідавана інтэрнэт-крам. Прычым поўнасцю нейтралізаванай інтэрнэт-краму лічым тады, калі затрыманы не толькі збытчыкі, але і арганізатары. Аб паспяховай рабоце сведчаць і медыцынскія індыкатары: ва ўстановы аховы здароўя дастаўлена менш асоб з атручваннямі наркотыкамі, у тым ліку са смяротнымі перадазіроўкамі; змяншаецца колькасць людзей, якія стаяць на прафілактычным і дыспансерным уліках. Тое, на што пакуль не ўдалося паўплываць, — павелічэнне колькасці непаўналетніх, уцягнутых у злачынную дзейнасць.

— І гэта нягледзячы на тое, што прафілактычная работа найперш накіравана менавіта на гэтую катэгорыю грамадзян...

— Нам важна не тое, што мы ў цэлым зрабілі ў пэўнай навучальнай установе. Канкрэтна даходзім да кожнага непаўналетняга: даём зразумець, што ён не адзін, калі яму спатрэбіцца дапамога, мы яе абавязкова акажам. У адносінах не толькі да непаўналетніх, але і ўвогуле маладых людзей укараняем такія метады работы, як стрымінгі, калі арганізоўваецца прамая сувязь з асобамі, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Мы бачым рэакцыю дзяцей і моладзі, што гэта ім западае ў душу. Хочацца верыць, пасля гэтага яны дакладна не захочуць апынуцца ў такіх месцах. Выступаючы на мерапрыемствах, заўважаем: ёсць заўвага да артыкула 328 Крымінальнага кодэкса, што дазваляе вызваліць ад адказнасці асобу, якая добраахвотна заявіла аб здзяйсненні злачынства. І такія станоўчыя прыклады маюцца. Ёсць і дзеці, якія прызналіся ў здзейсненым і не былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Гэта сведчыць аб тым, што да кагосьці мы ўжо дастукаліся.

— Непаўналетнія, уцягнутыя ў злачынную дзейнасць, самі з'яўляюцца спажыўцамі наркотыкаў?

— З 87 непаўналетніх, затрыманых летась, толькі 17 знаходзіліся ў стане наркатычнага ап'янення. Як правіла, непаўналетнія затрымліваюцца за збыт наркотыкаў. З кожным такім выпадкам мы індывідуальна ва ўзаемадзеянні з міліцыяй грамадскай бяспекі і інспекцыяй па справах непаўналетніх разбіраемся, праводзім вельмі шмат мерапрыемстваў ва ўстановах адукацыі. У тым ліку працуем з бацькамі, педагогамі: расказваем, як дзейнічаць пры выяўленні тых ці іншых прыкмет наркаспажывання, што рабіць, калі ёсць падазрэнні наконт уцягнутасці непаўналетняга ў злачынную дзейнасць.

— У другім чытанні прыняты змяненні ў крымінальнае заканадаўства. Замацоўваюцца альтэрнатыўныя, больш мяккія, пакаранні за нарказлачынствы. Ці не паўплывае гэта на пагаршэнне сітуацыі?

— МУС не было супраць гэтых новаўвядзенняў: рызык і пагроз мы не бачым. Іншая справа — калі б наркасітуацыя складвалася па-іншаму і не было б зніжэння па асноўных катэгорыях. Вядома, павелічэнне па непаўналетніх — таксама статыстыка. Аднак 17 чалавек — гэта шмат? Мы лічым, шмат. Для нас нават адзін непаўналетні, затрыманы па гэтым артыкуле, — ужо дрэнна. Калі раней адказнасць за збыт наркотыкаў прадугледжвала ад 10 да 20 гадоў пазбаўлення волі, то цяпер — ад 8 гадоў. Гэта таксама вельмі сур'ёзны тэрмін. Прадугледжаны віды пакарання, не звязаныя з пазбаўленнем волі: арышт да трох месяцаў (за захоўванне наркотыкаў). Гэтага часу дастаткова, каб зразумець, што пераступіў закон, і ўсвядоміць, што можаш быць на свабодзе.

— Якімі шляхамі ў Беларусь трапляюць наркотыкі?

— Незалежна ад палітычных і іншых момантаў злачынцы робяць спробы перасячэння граніцы Беларусі ў напрамку найперш Расіі. З мэтай транспарціроўкі буйных партый выкарыстоўваецца грузавы транспарт. Былі затрыманні і ў рэйсавых аўтобусах, легкавым, паветраным транспарце. Летась на тэрыторыі Беларусі выяўлены чатыры наркалабараторыі, дзве — на тэрыторыі краін СНД. Аднак яны не паспелі рэалізаваць сваю прадукцыю. У сувязі з тым, што ў нас у параўнанні з іншымі краінамі жорсткае крымінальнае заканадаўства, масавых выпадкаў стварэння наркалабараторый няма. Краіна кампактная, нам хутка становіцца аб усім вядома. Апошняя тэндэнцыя — наркабізнес пачаў выкарыстоўваць замежных грамадзян. За мінулы год мы затрымалі каля 80 іншаземцаў. Беларусаў, відаць, ім не хапае. Гэта сведчыць аб тым, што наша грамадства ў большасці разумее, што любыя дзеянні, звязаныя з наркотыкамі, прывядуць да непазбежнага пакарання.

— Ці дапамагаюць звычайныя людзі ў раскрыцці злачынстваў? Можна казаць аб згуртаванасці грамадства супраць наркотыкаў?

— Перыядычна да нас паступаюць шматлікія паведамленні: людзі звяртаюцца, падказваюць. Дзякуючы ў тым ліку іх інфармацыі мы затрымліваем тых, хто распаўсюджвае наркотыкі. Грамадства ўжо даўно аб'ядналася супраць наркотыкаў. Ні ў каго не ўзнікае сумнення, што гэта зло і пагроза нацыянальнай бяспецы.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МУС.

Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 4 марта 2025 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Гродно, ул. Белая, 30, У-238, микрорайон «Заболоть», 440100000002007996	0,1011	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Площадь застройки: 122 кв. м, фундамент: железобетон	37 846,86 (9 437,76; 28 409,10)	363,14	7 500,00
2	Гродненская область, г. Гродно, ул. Нектарная, 13, У-352, микрорайон «Барановичи 5, 6», 440100000003004970	0,1002	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности: 40 %. Количество надземных этажей: 1. Площадь застройки: 296 кв. м. Фундамент: бетон, наружные стены: блоки газосиликатные, внутренние стены: блоки газосиликатные, кирпич силикатный, перекрытие: плита железобетонная ребристая	95 031,25 (75 602,47; 19 428,78)	382,44	19 000,00

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны + 375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится 4 марта 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117, с 3 февраля по 26 февраля 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время

ПАШТОВЫ ЛЁС НАДЗЕІ

Ёсць час, калі пошта — у топе па наведваннях. А хочацца ўсе пытанні вырашыць хутка. Мне дапамагла дзяўчына па імені Надзея, якая працуе ў аддзяленні паштовай сувязі № 4 горада Бярозы, што на Брэстчыне. Яна расказала і пра тое, якія пасланні нам часам рыхтуе жыццё.

ПІСЬМО МАРЫ

Згодна са стэрэатыпам мы ўяўляем паштавікоў больш сталымі людзьмі, таму што ў час інтэрнэту і паскораных хуткасцяў здаецца, што гэта з былога, «аналагавага» жыцця. Але ж яно, калі разабрацца, нікуды не падзелася, бо чалавек лічбавай эпохі — жывая істота, якой і добрае слова патрэбна, і навіны з любімай газеты, і пенсія: на раёне далёка не ўсе пераводзяць яе на картку, выбіраючы рэальныя зносіны з паштальёнам. І ён можа быць як тое сонейка, якому дасягальныя і аддаленыя ад цэнтра вёскі.

Надзея Казак за амаль дзесяць гадоў працы на пошце прайшла розныя этапы. З даволі вялікім балам атэстата марыла стаць фармацэўтам. У нейкім сэнсе так і атрымалася, толькі лёс зрабіў карэкціроўку: аказалася, і на пошце можна выпрацоўваць асаблівыя лекі праз добры настрой. Каб не губляць год да новага паступлення, яна адвучылася дзесяць месяцаў у Брэсцкім політэхнічным каледжы, пасля пайшла працаваць на пошту — і ўцягнулася. Тут пастаянны рух, не засумуеш. «Было цікава кантактаваць з людзьмі — яны такія розныя, але за кожным асабліві вопыт. Мне здаецца, што я магу знайсці падыход да кожнага чалавека», — прызнаецца Надзея. Пачынала яна ў аддзеле агульнавытворчага персаналу і некалькі гадоў працавала па вёсках. На нейкі час гарадская дзяўчына нават перасялілася ў вёску Спорава, куды яе накіравалі, але Надзея ўсё ж па большасці ездзіла туды з горада: паднімалася а 4-й гадзіне раніцы і ішла на аўтобус. Калі была магчымасць, яе вазіў тата: у дачкі адказная работа, яна ўжо была загадчыкам аддзялення сувязі, у яе падпарадкаванні значыліся паштальёны больш сталага веку...

ПІСЬМО КАХАННЯ

Аднойчы таты не стала... Ад роспачы і думак пра тое, як будзе далей, дзяўчыне дапамог пазбавіцца закаханы хлопец. Правоў на кіраванне машыны Надзея не мела, але Аляксандр прапанаваў дастаўляць яе да месца работы ў вёску.

Яны пазнаёміліся на пошце: малады чалавек прыйшоў як кліент і прыкмеціў дзяўчыну-аператара. Працоўны дзень быў у разгары, навокал людзі, ён сышоў... А потым адшукаў Надзею праз сацсеткі, сталі перапісвацца. З таго часу пошта — гэта і яго свет. З задавальненнем дапамагаў каханай — гэта дазваляла яго праца па зменах у сістэме ЖКГ.

Калі пабраліся шлюбам, Надзея вучылася ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі — мама настойвала: трэба думаць пра самаразвіццё. У гэтым падтрымаў і Аляксандр. Нараджэнне іх сыночка прыпала на сесію — якраз быў дзень экзамену. А ўжо праз які месяц яны ўсёй сям'ёй рушылі на машыне ў Мінск: муж, Надзея з немаўлём і яе мама, якая займалася хлопчыкам, пакуль дачка трымала іспыт. Пасля тата браў водпуск і сядзеў з хлопчыкам, калі маладая мама здавала сесіі. Праз гнуткі графік ён і цяпер водзіць сына на гурткі, а па дарозе яны заходзяць на работу да Надзеі, а там столькі цікавага: можна выбраць паштоўку або паглядзець дзіцячыя часопісы. А нядаўна хлопчык сам намаляваў пасланне да Дзеда Мароза: ведае, што пісьмо абавязкова павінна трапіць да адрасата і тады ўсё здзейсніцца.

ПІСЬМО БУДУЧЫНІ

Надзея Казак пасля дэкрэтнага водпуску вярнулася ў тое самае гарадское аддзяленне, дзе знайшла сваё шчасце. Лічыць, што дыплом аўтаматычна не ўздымае яе над іншымі супрацоўнікамі пошты, бо кожны тут выконвае свае абавязкі. Яна цяпер мае другую катэгорыю спецыяліста па паштовай дзейнасці, займаецца абслугоўваннем юрыдычных асоб: прымае карэспандэнцыю, адпускае паштовую прадукцыю... «Лічу, што вышэйшая адукацыя стварае падмурак для самаразвіцця, але кожны выбірае сам, у які бок рухацца. Сучасная пошта — гэта свет камп'ютарных тэхналогій і лічбавых сэрвісаў, мы асвойваем новыя паслугі, праграмы, а гэта ўсё вельмі цікава і прыцягальна для моладзі, — гаворыць дзяўчына. — У мяне тут не проста калегі, а сябры, мы сустракаемся і па-за работай, сумесна адзначаем святы, далучаемся да цікавых спраў, якія адбываюцца на прадпрыемстве і ў раёне. Я лічу сябе пасрэднікам паміж раённым кіраўніцтвам Беларускага саюза моладзі і радавымі маладымі людзьмі — імкнуся далучыць іх да важных і цікавых падзей». Адна з тых, што найбольш запомнілася Надзеі, — велапрабег ад Бярозы да Броннай Гары, дзе ў гады вайны былі пакараныя смерцю каля 50 тысяч чалавек. Такія мерапрыемствы вучаць шанаваць жыццё. Нечаканасцю, якая моцна ўзрушыла, стаў для Надзеі ўдзел у конкурсе «Міс Пошта» па Брэсцкім філіяле РУП «Белпошта», дзе яна атрымала прыз глядацкіх сімпатый, прадэманстраваўшы ўласныя таленты.

«Надзея — дзяўчына з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і чалавек адказны, — адзначае **начальнік Бярозаўскага РУПС Анатоль БОРАЎЦАЎ.** — На пошце такія людзі патрэбны: за імі будучыня».

Ларыса ЦІМОШЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

ОРГАНИЗАТОР: ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

№ лота	Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение	Площадь (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка 10 %, руб.
1	Витебская обл., Чашникский р-н, аг. Черея, ул. Озёрная, 8	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,3995	225183013101000442	3042,03	6 000,00	600,00

Условие проведения аукциона:
наличие не менее двух участников;
заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения.

Победителю аукциона либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:
► возместить затраты, связанные с проведением аукциона;
► внести плату за земельный участок.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:
подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.

Аукцион состоится **4 марта 2025 года в 11.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 17.00 по **25 февраля 2025 года** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка, кроме того, в комиссию предоставляются:
гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет р/с BY68AKBB36413290522002200000 в ОАО «Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300986851, код платежа 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактный телефон 8 (02133) 6 41 45, 6 05 30.

ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ГОМЕЛЬЖИЛПРОЕКТ» СОСТОИТСЯ 3 МАРТА 2025 Г. В 13.00.

Повестка дня
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2024 год и основных направлениях деятельности общества в 2025 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества за 2024 г.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2024 г.
4. Об утверждении распределения прибыли общества по итогам работы за 2024 г., о выплате дивидендов за 2024 г.
5. Об утверждении основных направлений использования прибыли в 2025 году и первом квартале 2026 г.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания – 31 января 2025 года.
Форма проведения собрания – очная.
Место проведения собрания – по месту нахождения общества: ул. Кирова, 17, г. Гомель.
Время регистрации участников собрания: с 12.30 до 13.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 11.02.2025 (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет

УНП 400022625

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Логойский молочный комбинат»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1878	Емкость для приемки молока объемом 30 п. м, инв. № ТО-ОС-001; емкость для приемки молока объемом 30 п. м, инв. № ТО-ОС-002; счетчик-расходомер молочный, инв. № ТО-ОС-003; счетчик-расходомер молочный, инв. № ТО-ОС-004; козел электрический Kospel EKCO.L2M-36, инв. № ТО-ОС-005; емкость ОЗУ-0,63 с паровой рубашкой, инв. № ТО-ОС-006; насос центробежный молочный нержавеющий (производительностью 10 куб. м/час), инв. № ТО-ОС-007; насос центробежный молочный нержавеющий (производительностью 25 куб. м/час), инв. № ТО-ОС-008; насос центробежный молочный нержавеющий (производительностью 25 куб. м/час), инв. № ТО-ОС-009; насос центробежный молочный нержавеющий (производительностью 25 куб. м/час), инв. № ТО-ОС-010; насос ШНК 14-10 (ОРА-10), инв. № ТО-ОС-016; фильтр тонкой очистки производительностью 30 куб. м/час, инв. № ТО-МЦ-011; фильтр тонкой очистки производительностью 30 куб. м/час, инв. № ТО-МЦ-012; обратный клапан ДУ50, инв. № ТО-МЦ-013; распределитель, инв. № ТО-МЦ-014; распределитель, инв. № ТО-МЦ-015; водонагреватель аккумуляционный электрический Thermex Bravo 100 Wi-Fi, инв. № ТО-МЦ-017	66 912,00	6 691,20	3 345,60

В отношении лота проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 245 (30379) от 17.12.2024 г., стр. 13
Местонахождение лота: Минская обл., Логойский р-н, Логойский с/с, д. Заозерье, промзона Заозерье-3

Дата и время проведения торгов	**10 февраля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	С 10.00 28 января 2025 года до 16.00 6 февраля 2025 года

Условия для участия в торгах: 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 1878, ООО «Логойский молочный комбинат», проводимых 10.02.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня оплаты затрат на организацию и проведение торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375293042560, Андрей**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь.

Информация о продавце	ООО «Логойский молочный комбинат» в лице директора Чорнийчука Александра Павловича, тел. +375296203380 (Минская обл., Логойский р-н, Логойский с/с, д. Заозерье, 3)
Организатор аукциона	ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: • 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg

АБЛІЧЧЫ ПАЭТА ВАЧЫМА МАСТАКОЎ

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адкрылася выстаўка «У кожнага свой Купала!», прымеркаваная да 100-годдзя надання Янку Купалу ганаровага звання «Народны паэт Беларусі».

Гэта першае з юбілейных мерапрыемстваў, якімі будзе насычаны 2025 год. Наведвальнікаў чакаюць літаратурныя вечары, тэатральныя пастаноўкі па творах Янкі Купалы, музычныя імпрэзы, конкурсы і выставачныя праекты.

— Сёлета мы адзначаем 100 гадоў з дня надання Янку Купалу ганаровага звання «Народнага паэта БССР». Гэта была значная падзея не толькі ў жыцці паэта, але і ў гісторыі ўсёй беларускай літаратуры. Выставачны праект «У кожнага свой Купала!» — яшчэ адна магчымасць ізноў сустрэцца з паэтам. З такім, якім яго ўяўлялі мастакі, з такім, якім ён застаўся на фотаздымках, — адзначыла ў прывітальным слове **дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна ГАЛІНСКАЯ.**

Для часовай экспазіцыі выбраныя 11 жывапісных твораў і шэсць скульптурных работ, створаных рознымі аўтарамі і ў розны час. Вобразы паэта, увасобленыя мастакамі, можна параўнаць з прадстаўленымі на выстаўцы фотаздымкамі Янкі Купалы за 1904 і 1912, 1939 і 1941 гады. Скульптурныя работы, прыжыццёвыя партрэты народнага паэта і сюжэтныя кампазіцыі беларускіх майстроў па-новаму раскрываюць шматгранную асобу вялікага творцы. Тут можна ўбачыць маладога Купалу, які толькі ступіў на літаратурныя шляхі, і Купалу ў самым росквіце яго паэтычнага таленту, і ў сумны час, напоўнены горам і выпрабаваннямі, — падчас эвакуацыі.

Адна з цікавінак экспазіцыі — творы сябра паэта, мастака Дзмітрыя Полазава. Прадстаўленыя партрэты Янкі Купалы былі напісаны творцам у 1921 годзе ў Мінску на вуліцы Садова-Узбярэжнай — цяпер там парк імя Янкі Купалы. Карціны Дзмітрый Полазаў збярог у блакадным Ленінградзе, а ў 1947 годзе перадаў у музей.

Да вобраза класіка неаднойчы звяртаўся народны мастак Беларусі Міхаіл Савіцкі. На выстаўцы можна ўбачыць яго палатно «Янка Купала. 1942» (1988), эмацыянальна насычанае і сімвалічнае для тых, хто ведае лёс паэта.

На адкрыццё выставачнага праекта завіталі **кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт і празаік Міхась ПАЗНЯКОЎ, скульптар і лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы Сяргей ГУМІЛЕЎСКІ.**

— Янка Купала — узор служэння роднай зямлі і свайму народу, — адзначыў у сваім выступленні Міхась Пазнякоў. — Мой Купала — гэта мой настаўнік, у якога можа вучыцца кожны, не толькі пісьменнік. Вучыцца быць са сваім народам, разумець і паважаць сваю культуру. Мой Янка Купала — гэта і сёння настаўнік творчай моладзі, таму што яго творчасць з'яўляецца нашай асновай, а нічога новага не можа ўзнікнуць без глебы.

Сёння імя народнага паэта Беларусі Янкі Купалы вядомае на ўвесь свет, яго творы друкуюцца на розных мовах, а геаграфія яго прыхільнікаў ужо даўно выйшла за межы нашай краіны. У 2006 годзе на Кутузаўскім праспекце ў Маскве быў устаноўлены помнік Янку Купалу па праекце Льва і Сяргея Гумілеўскіх.

— Да творчасці Янкі Купалы я прыйшоў дзякуючы бацьку. Ён пранёс захапленне народным паэтам праз усё жыццё і ў сваіх работах перадаў наступным пакаленням. У помніку на Кутузаўскім праспекце мы паспрабавалі адлюстраваць натхнёнага паэта, сэрцам прывязанага да Беларусі, — падзяліўся на адкрыцці выстаўкі Сяргей Гумілеўскі.

Творы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, аздабляюць старонкі шматлікіх друкаваных выданняў, у тым ліку і падрыхтаваны музеем альбом-каталог «Я адплацію народу, чым моц мая магла» (2019).

Атмасферу цеплыні і творчага яднання падчас адкрыцця стварылі студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Наведаць выставу і знайсці там свайго Купалу можна да 7 красавіка.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Извещение о проведении 28 февраля 2025 года аукциона № 01-У-25
с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)

Номер предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Краткая информация о расположенных на земельных участках капитальных строениях (зданиях, сооружениях), подлежащих сносу	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб.
1	г. Минск, по ул. Владислава Сырокомли	0,9661	Для строительства объекта «Объект торговли и общепита с многоуровневой автостоянкой по ул. Владислава Сырокомли в г. Минске»	16 019,07	58 427,31	11 500,00	Опоры освещения. Пешеходные дорожки (из плитки мелкоштучной бетонной, из плит железобетонных, асфальтобетонные)	2 364,18

Организатор аукциона: государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.10.

Форма аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Минске, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет.

Аукцион состоится **28 февраля 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7. Прием заявлений на участие в аукционе и прилагаемых к ним документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2 **с 29 января 2025 г. по 25 февраля 2025 г.** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 15.30). Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определен Положением «О порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 № 32. Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Порядок оформления участия в аукционе

Для участия в аукционе индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок представляет организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (с отметкой банка). Задаток по соответствующему предмету аукциона перечисляется в срок, установленный для приема документов, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 01-У-25;

подписанное в двух экземплярах соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 09.09.2013 № 43), включающее условие о задатке, обязательство по уплате штрафных санкций в соответствии с законодательством;

дополнительно представляется:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе предъявляют:

заявитель (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия;

уполномоченное лицо (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе;

представитель уполномоченного лица – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

После получения необходимых документов от юридического лица или индивидуального предпринимателя на участие в аукционе ему выдается билет участника с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе.

Порядок определения победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона)

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, характеристики земельного участка, цены предмета аукциона и размера увеличения цены предмета аукциона (далее – шаг аукциона). Шаг аукциона составляет от 5 до 15 процентов от предыдущей цены, объявляемой аукционистом. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. Если по объявленной аукционистом цене предмета аукциона аукционные номера подняли два участника аукциона и более, аукционист объявляет новую цену предмета аукциона в соответствии с шагом аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним индивидуальным предпринимателем или юридическим лицом либо для участия явился только один участник, то такой аукцион признается несостоявшимся. В таком случае единственный участник несостоявшегося аукциона при наличии его согласия приобретает предмет аукциона в размере начальной цены, увеличенной на 5 процентов.

Сведения об обязанности победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона)

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

- внести плату за предмет аукциона;
- возместить Минскому горисполкому расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона;
- возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре).

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Оплата стоимости предмета аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Дополнительная информация

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время. Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанном земельном участке и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе материалов о предоставлении земельного участка. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участка осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение объекта. Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в составе материалов о предоставлении земельного участка для проведения аукциона.

Снос объектов и возмещение убытков производится в соответствии с законодательством лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Ориентировочный размер убытков определяется в проекте отвода земельного участка организациями по землеустройству, включенными в перечень организаций, осуществляющих определение размера убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, установленный Советом Министров Республики Беларусь, самостоятельно либо с привлечением на основании договора субподряда иной организации, включенной в такой перечень.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: Минского городского исполнительного комитета • www.minsk.gov.by (раздел «Земля и имущество»/«Продажа/Аренда»/в отношении земельных участков), организатора аукциона • www.mgcn.by (раздел «Земельные участки»).

Контактный телефон + 375 (17) 363-96-72.

СПОРТ-ТАЙМ

ЮНІЁРЫ П'ЕДЭСТАЛА НЕ БАЯЦЦА

У традыцыйным аглядзе «Звязды» — спартыўныя навіны

ГЕРАІНІ ТЫДНЯ. У Краснаярску прайшоў міжнародны турнір па вольнай барацьбе «Кубак Івана Ярыгіна», на якім беларускія спартсменкі заваявалі пяць медалёў. Пераможцамі турніру сталі Вераніка Іванова (да 62 кг) і Аліна Шаўчук (да 68 кг). Анастасія Зімянкова, якая выступае ў катэгорыі да 76 кг, заваявала бронзавы медаль. Трэція месцы занялі таксама Вікторыя Рэбікава (да 50 кг) і Надзея Буланая (да 59 кг).

ПОСПЕХ ТЫДНЯ. Беларуская спартсменка Аляксандра Пятрова стала пераможцай міжнародных спаборніцтваў па стральбе з пнеўматычнай зброі H&N Cup у Германіі. У турніры па стральбе з малакалібернага пісталета з 10 метраў сярод юніёрак яна перамагла з вынікам 237,6 бала. Таксама Аляксандра была найлепшай у стральбе з пнеўматычнага пісталета з 10 метраў.

КАМАНДА ТЫДНЯ. Юніёрская зборная Беларусі па валейболе стала прызёрам турніру ў Санкт-Пецярбургу, прысвечанаму 81-й гадавіне зняцця блакады Ленінграда. На групавым этапе спаборніцтваў падапечныя Аляксея Кавалёва абгулялі каманды Санкт-Пецярбурга (25:21, 25:21) і Ленінградскай вобласці (25:23, 25:15), у паўфінале беларусы былі мацнейшымі за прадстаўнікоў Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі (25:14, 25:19). У вырашальным паядынку нашы валейбалісты саступілі сапернікам з Масквы (21:25, 25:22, 21:25, 20:25) і заваявалі сярэбраныя медалі.

НАДЗЕІ ТЫДНЯ. Беларускія спартсменкі выйгралі пяць залатых медалёў традыцыйнага міжнароднага турніру па мастацкай гімнастыцы Winter Queen Cup. У мнагабор'ї Дар'я Ткачова паказала найлепшы вынік — 102,783 бала, што прынесла ёй першае месца. На другім месцы — Анастасія Салас (101,567), тройку прызёраў замкнула Дар'я Вярэніч (99,483). Дастойна выступілі беларускія грацыі і ў фіналах асобных відаў. Дар'я Вярэніч перамагла ў практыкаваннях з абручом і булавамі. Анастасія Салас стала пераможцай у практыкаванні са стужкай. Дар'я Ткачова стала найлепшай у практыкаванні з мячом.

ПАРАЖЭННЕ ТЫДНЯ. Першая ракетка свету Арына Сабаленка не змагла трэці раз запар абараніць тытул чэмпіёнкі Australian Open. У фінале Адкрытага чэмпіяната Аўстраліі яна ўступіла амерыканскай тэнісістцы Мэдысан Кіз, якая займае 14-е месца ў рэйтынгу WTA, — 3:6, 6:2, 5:7. На шляху да фіналу ў Мельбурне Арына Сабаленка перамагла амерыканку Слоан Стывенс (81-ы нумар сусветнага рэйтынгу), іспанак Джэсіку Бузас Манэйра (54), Паўлу Бадосу (12), расіянак Міру Андрэеву (15), Анастасію Паўлючэнкаву (32) і датчанку Клару Таўсан (42). Да гэтага Арына Сабаленка двойчы запар выйгравала першы ў сезоне турнір серыі «Вялікага шлема». Нягледзячы на гэта паражэнне, Арына Сабаленка захавала першы радок сусветнага рэйтынгу, у яе актыве 8956 балаў.

АБ'ЯВЫ ТЫДНЯ. Міжнародная шахматная федэрацыя (FIDE) дапусціла

беларускія і расійскія каманды юнакоў да 18 гадоў да ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах у нейтральным статусе. FIDE таксама дапусціла да ўдзелу ў камандных спаборніцтвах у нейтральным статусе шахматыстаў з Беларусі і Расіі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя. Кіраўнік Міжнароднай федэрацыі лыжных відаў спорту (FIS) Юхан Эліяш выступіў за вяртанне беларускіх і расійскіх спартсменаў на сусветную арэну.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

28 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

1577 год — горад Мазыр атрымаў Магдэбургскае права і герб, Магілёў — поўнае Магдэбургскае права і свой першы герб.

1588 год — у Вільні быў падпісаны трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага. Гэта быў збор усіх законаў, якія дзейнічалі тады ў ВКЛ, прататып Канстытуцыі, помнік беларускага пісьменства і юрыдычнай думкі, які лічыўся адным з самых перадавых зборнікаў законаў у тагачаснай Еўропе, што дзейнічаў на нашых землях 250 гадоў, да 1840 года. Па ўзоры Статута пазней былі напісаны зборы законаў многіх краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Наватарствам у параўнанні з сучасным яму еўрапейскім правам было і тое, што Статут уводзіў прынцып падзелу ўлады. У той час дзяржаўнай мовай была старабеларуская, што агаворвалася ў Статуце. Сам дакумент быў таксама надрукаваны на старабеларускай мове. Ён стаў першым заканадаўчым зборам, надрукаваным кірыліцкім шрыфтам.

1903 год — нарадзіўся Іван Сямёнавіч Былінскі, дзяржаўны, гаспадарчы і партыйны дзеяч БССР. Старшыня Савета Народных Камісараў Беларускай ССР (1940—1944), першы сакратар Палескага абкама КПБ, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

У свеце

1825 год — у Расіі наступіла эпоха палацавых пераваротаў — часавы прамежак у палітычным жыцці Расіі ў XVIII стагоддзі, калі пераход вышэйшай дзяржаўнай улады адбываўся шляхам здзяйснення гвардзейцамі ці прыдворнымі палацавых пераваротаў. Аўтар тэрміна В. В. Ключэўскі датуе гэту эпоху перыядам ад смерці Пятра I у 1725 годзе да ўступлення на прастол Кацярыны II у 1762-м. Аднак уяўленне аб тым, што менавіта гвардыя вызначае, да каго пяройдзе пасад, існавала таксама ў пачатку XIX стагоддзя, падчас падзей міжцарства 1825 года (Паўстанне дзекабрыстаў).

1986 год — катастрофа амерыканскага касмічнага карабля «Чэленджэр» з сямю астранаўтамі на борце.

НАДВОР'Е

СОНЕЧНА І НЕ ПА СЕЗОНЕ ЦЁПЛА

Чым адзначыцца апошні тыдзень студзеня?

Фота Віктара ІВАНЮКАВІЧА.

Апошні тыдзень студзеня ў Беларусі будзе сонечны і не па сезоне цёплы, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

«Пасля перыяду пахмурнага надвор'я нарэшце выгляне сонца. Надвор'е ў асноўным будуць вызначаць цёплыя паветраныя масы і малаактыўныя франтальныя падзелы», — адзначылі ў Белгідрамеце.

Сёння будзе пераважна без ападкаў. У начны і ранішні час месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 °С, днём — 4—10 цяпла, па паўднёвым захадзе да 12 °С.

У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра складзе ноччу 2—8 °С, днём — 5—12 цяпла.

У чацвер чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ноччу месцамі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах можа быць слабы туман. Тэмпература паветра ноччу — ад мінус 1 °С да плюс 5 °С, днём — 4—9 цяпла.

У пятніцу ноччу будзе пераважна без ападкаў, раніцай і днём месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаецца слабы туман, ноччу і раніцай слабы галалёд. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 1 °С да плюс 5 °С, днём — 1—7 цяпла.

У суботу на большай частцы тэрыторыі, днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). Месцамі могуць быць слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу — ад мінус 3 °С да плюс 4 °С, а днём — ад мінус 1 °С да плюс 6 градусаў.

У нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (снег, мокры снег, дождж). Месцамі можа быць слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 4 °С да плюс 2 °С, днём — ад мінус 2 °С да 4 цяпла.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 382000000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 90.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12